*) Канец слова (чак) тут як і далей, не вымаўляецца.

Ой Ты,Саду


Moderato assai
mf
Ой ты,
mp
са- ду, сад(ы) мой(і) зе-ля- ненькі, ох(ы), ой ты,
са- ду, сад(ы) мой(і) зя- лё- ны.
для канца
p

Ды Я Жала Да Вечара

Andante molto

mp

Ды я жа- ла да

pp

ве- ча- ра, ой, ды жа- ла-ж я да

ве- ча- ра.

pp

для канца

p

Адна із лепшых жніўных і наогул народных беларускіх песьняў. Як у мэлёдыі, гэтак і ў вапрацоўцы захаваныя волгукі прыроды й асаблівасьці народнага выкананьня.

1. Ды я жала-ж да вечара,
   Ой, ды жала-ж я да вечара.
2. Баліць мая сярэдзінка,
   Ой, баліць мая сярэдзінка.
3. Каб я мела дзіцятачка,
   Ой, каб мела я маленькае.
4. Можа яно-б заплакала,
   Ой, сярэдзінка адпачнула.
5. Ды я жала-ж да вечара,
   Ой, ды жала-ж я да вечара.

Як у Нас Улетку



пай-шлі дзяў-

дзяўчаткі у лес па-я- гад-кі, у бор па грыб-

1. 2. 3. 4.

кі.

5.

не.

f

Папулярная народная, ягадная песьня. Тут пададзены новы тэкст, паводля фальклёрных зборнікаў. Апрацованая для ансамблевага выкананьня. Песьню мажліва выконваць і солё (сапрана - верхні голас) і дуэтам.

1. Як у нас улетку зарадзілась
   Ягада у бары,
   Пайшлі дзяўчаткі
   У лес па ягадкі,
   У бор па грыбкі.

2. Ой, адна дзяучына заблудзіла
   У цёмным лясочку
   Ды прыблудзіла
   Да рэчкі Дунаю,
   На крут беражок.

3. Ох(ы) закрычала красна дзеўка
   Сваім тонкім голасам;
   Яна крычала,
   Ой, яна гукала
   Перавожчыка.

4. Маладзенькі ты-ж мой перавожчык,
   Перавязі мяне
   На той бок дадому
   Меднымі грашыма
   Табе заплачу.

5. Ой, ды не плаці мне, красна дзеўка,
   Меднымі грашыма,
   А ці ты пойдзеш,
   Красная дзеўка,
   Замуж за мяне.

Хадзіў,Пахдзіў Ясь Па Полю

Адна знайбольш характэрных народных песьняў. Ейны глыбокі зьмест і старадаўныя прыёмы строю даюць падставы аднесьці яе да цыклю гістарычных песьняў. Ейны эпічны характар трэ' прыняць на увагу пры выкананьні. У мэледыі (солё для мэцца-сапрана) захаваныя прыёмы народнага выкананьня.

1. Хадзіў, пахадзіў Ясь па полю,
   Ох, ды сеяў, расьсяваў васілёчкі.
   Хор: Сеяў, расьсяваў васілёчкі.

2. Васілёчкі-ж мае, дарагія,
   Ох(ы), а хто-ж вас(ы) будзе паліваці?
   Хор: А хто-ж вас будзе паліваці?

3. А міленькі мой за Дунай пайшоў,
   Ох(ы), за Дунай(і) пайшоў — не вярнуўся.
   Хор: За Дунай пайшоў — не вярнуўся.

4. Хадзіў, пахадзіў і.г.д. (першая зваротка).

Хадзіў,Пахдзіў Ясь Па Полю



Ой, Ляцелі Гусі

Andante

mp

Ой, ля- це- лі

гу- сі з да- лё- ка- га бро- -

ду, се- лі на Ду- на-

mf

p

і, ўска -ла- ці- лі во- ду.



Народная лірычная песьня, апрацаваная для солё (тэнара) з фартэп'янам.

1. Ой, ляцелі гусі з далёкага броду,
   Селі на Дунаі, ўскалацілі воду.
2. Ой-жа, тыя гусі марна запрапалі,
   Як мы любіліся, цяпер перасталі.
3. Як мы любіліся, нас бяда ня знала,
   Цяпер разыйшліся, як чорная хмара.
4. Чорна хмара ідзе, дробны дожджык будзе,
   З нашага каханьня нічога ня будзе.

Пахадзілі Мае Ножкі

Народная папрадкавая песьня для жаночага дуэту ці ансамблю.

1. Пахадзілі мае ножкі дый па беламу сьняжку, ды ой,
   Забалела мае сэрца ды па міламу дружку.
2. Забалела мае сэрца ды па міламу дружку, ды ой,
   Ой, пайду я прахаджуся па крутому беражку.
3. Ой, пайду я прахаджуся там, дзе міленькі жыве, ды ой,
   Запытаю я мілога: "Чаго ў госьцейкі ня йдзе?"
4. Запытала я мілога — ён адказу не дае, ды ой,
   Ці няма яго у хаце, ці забыўся на мяне.

Пахадзілі Мае Ножкі

Moderato

Па-ха- дзі-лі ма-е нож- кі дый па

mf

бе-ла-му сьняж- ку, ды ой, за- ба- ле- ла ма- ё

sf *mp*

сэр- ца ды па мі- ла- му друж- ку. За- ба-

1.2.3.

не.

4.

Ці Я ў Цябе,Мой Ты Татухна





Вясельная абрадавая песьня. Падаецца тут із захаваньнем стылю народнага выкананьня.

1. Ці я ў цябе, мой ты татухна, не гарую?
   Што ты, мяне, аддаеш, маладую?
2. Прадай лепей, мой ты татухна, сад зялёны
   Ды не прадавай мяне — маладзенькай.
3. Ой, як горка, мая мамачка, рэдзька з палыном
   Так-жа будзе горка мне за чужым сталом.

Баліць Мая Галованька

Лірычная песьня, характэрная з свайго народнага выкананьня. Дадзеная тут для салёвага выкананьня для мэцца-сапрана.

1. Баліць мая галованька,
   Ой, баліць-жа, мая маці.
   Нечым тую галованьку,
   Нечым яе зьвязаці.
2. Завяжу сваю галоўку
   Хустачкаю ды бяленькай,
   Сяду, сяду пад вакенца-
   Ці ня йдзе мой міленькі.
3. Ой, ідзеце-ж, прывядзеце
   Вы таго-ж майго мілога,
   Разьвяжэце, разьвяжэце
   Вы маю ды галоўку.
4. Прыйдзе вечар, ночка цёмна,
   А я пад вакном чакаю,
   Хустачку маю бяленьку
   Сьлязой чыстай абмываю.

Баліць Мая Галованька

Moderato assai

f

Ба- ліць ма-я га- ло-

вань-ка, ой, ба- ліць- жа, ма- я

ма- ці. Не-чым ту- ю га- ло- вань-ку,

не- чым я- - е зьвя- за- ці.

для канца

Туман

Andante

Хор

p

Ту-ман, ту-ман па да-

p

mp

лі-не, шы- рок ліс-ток на ка- лі- не,

mp шы- рэй та- го на ду- боч- ку,- клі-ча га-

mp



Узор народнай лірыкі. Тут пададзеная ў апрацоўцы для хору, але можа быць выкананая дуэтам ці ансамблем на два галасы (партыі сапрана й альту) Пажадана пачынаць песьню зь піянісіма, паступова павялічваючы сілу голасу да 3-яе звароткі, а потым ізноў зьмяншаючы яе да піянісіма.

1. Туман, туман па даліне,
   Шырок лісток на каліне,
   Шырэй таго на дубочку,
   Кліча галуб галубачку.

2. Кліча сваю, ня чужую: *)
   — Чакай, сэрца пацалую.
   — Нашто табе цалаваці,
   Сэрцу тугі задаваці.

3. — Не задавай сэрцу тугі,
   Ня возьмеш ты, возьме другі;
   Не задавай сэрцу тугі,
   Ня возьмеш ты, возьме другі.

4. Туман, туман і г.д. (першая зваротка).

*) Гэтыя два радкі пры харавым выкананьні песьні выконваюцца басамі й тэнарамі.

Палыночак


Lento
Ой, па- лын мой, па- лы-
но-чак,
ой, па-лын - гор- ка-я тра- ва; гар- чэй
ця- бе, па- лы- но-чак, ўва ўсім по-лі ды ня-
ма; гар-чэй ця- - бе, па- лы- но-чак, ўва ўсім



Народная лірычная песьня, выключная паводля сваёй глыбіні, пранікліваcьці й прачуласьці. Апрацаваная для жаночага ансамблю. Можа быць выканаваная таксама й салёва (сапрана), выкарыстоўваючы ўсюды партыю першага голасу, за выняткам канца (ад словаў:"...ўва ўсім полі ды няма"), калі сьпяваецца партыя другога голасу, каб адказаць народнаму арыгіналу.

1. Ой, палын мой, палыночак,
   Палын — горкая трава;
   Гарчэй цябе, палыночак,
   Ўва ўсім полі ды няма. (2 разы)

2. Ой ты, доля, мая доля,
   Доля горкая мая;
   Гарчэй цябе, мая доля,
   Ўва ўсім сьвеце ды няма. (2 разы)

3. (Як і першая зваротка).

Дубравчка

Народная веснавая абрадавая песьня, што належыць да ўзораў найбольш характэрнага песеннага строю.

1. Дубравачка, ох(ы), зялёная,
   О-ой, зялёная, ах(ы), Божа-ж мой!

2. Ой, як па той, ох(ы), дубравачцы,
   Шла ды малодачка, ах(ы), Божа-ж мой!

3. У шэранькай, ох(ы), зязюленькі,
   Пыта...,ой, ды пытала, ах(ы), Божа-ж мой!

4. Чаго мілы, ох(ы), ня прыходзіць,
   О-ой, можа кінуў, ах(ы), Божа-ж мой!

Дубравчка


Moderato
mf
Дуб- ра- вач-
ка, ох (ы), зя- - - лё- на- я,
о- - - й, зя- лё-на- я, ох(ы), Бо- жа-ж
1. 2. 3. 4.
мой!
для канца
мой.

А ў Нашага Пана

Allegretto

Хор

mf

А ў на- ша-га па-на

Ой, ой, ой,

ды да- жы- нач-кі ра- на,

Ра- ю, мой Ра-ю,

1.2.3.4.

ды да-жы- нач-кі ра- на.

ой

ой

rit

ды да-жы- нач-кі ра-на, ой.

ой

ды да-жы- нач-кі ра-на, ой.

f rit



Народная дажынкавая песьня. Выконваецца рухава й весела. Песьня можа выконвацца й жаночым дуэтам альбо ансамблем — верхні радок.

1. А ў нашага пана
   Ды дажынкі рана,
   Раю, мой Раю, ды дажыначкі рана.
2. Шырокае поле,
   Ды жыта ядраное,
   Раю, мой Раю, ды жыта ядраное.
3. А мы жыта жалі,
   Ой, ды ў копы паскладалі,
   Раю, мой Раю, ой, ды у копы паскладалі.
4. Да нас прыхадзіце,
   Падарункі прынасіце,
   Раю, мой Раю, падарункі прынасіце.
5. (Як і першая зваротка).

Ах Ты, Дубе

Народная лірычная песьня з цыклю "Абы калі" для аднаго ці двох галасоў або для ансамблю.

1. Ах ты, дуб'е, ты, бяроза,
   Шырок лісток на табе. (2 разы)
2. Абяцаўся-жа ты, мілы,
   Што ня кінеш ты мяне. (2 разы)
3. А як прыйшла худобачка,
   Пакідаеш ты мяне. (2 разы)
4. А я з тугі пайду ў лугі,
   Там развею злу бяду. (2 разы)
5. Ах ты, дуб'е і г.д. (першая зваротка).

Ах Ты, Дубе

Andantino

mp

Ах ты, дуб'-е, ты, бя-

ро-за, шы-рок ліс-ток на та- бе; ах ты,

rit

дуб'-е, ты, бя- ро- за, *mf* шы-рок ліс-ток на та- бе.

mf rit

1. 2. 3.

а- бя - ой

mf

Ой, Пры Дунаі

Con moto

1. 2. 3.

mp

Ой, пры Ду-

p

на- - і, пры ці- ху- сень- кім,

ой, поз- на, поз- - на пры ці- ху-

сень- кім.

4.

mf

più

mf Хло- пец дзяў- чы- - не ка- жа: "Па-

е- ду, *f* ко- ні- ка ма- - ю,

вя- но- чак зна- ю, ой, поз- на,

rit a dim

поз- на, я сам па- е- ду.

p *mp*

allargando

для канца

mf Ой, пры Ду- на- - і,

mf rit

p пры ці- ху- сень- кім.

Народная песьня для салёвага выкананьня. Першыя тры звароткі выконваюцца на адну мэлёдыю. 4-я зваротка — на іншую. Пасьля яе ізноў, як з пачатку, да знака ⊞, адкуль ісьці да канца.

1. Ой, пры Дунаі, пры ціхусенькім,
   Ой, позна, позна пры ціхусенькім.

2. Дзяўчынка мыла, вянок забыла,
   Ой, позна, позна вянок забыла.

3. Ды хто паедзе па мой вяночак?
   Ой, позна, позна, па мой вяночак.

4. Хлопец дзяўчыне кажа: "Паеду,
   Коніка маю, вяночак знаю,
   Ой, позна, позна, я сам паеду."

5. Ой, пры Дунаі пры ціхусенькім,
   Ой, позна, позна, пры ціхусенькім.

Ой,Борам,Борам

Moderato

mp

Ой, бо-рам бо- рам, ба-ра- ві- но- ю, ба-ра-ві- но- ю.

mp

ой, ой, ба-ра-ві- но- ю.

А хто там е- дзе?-Князь з дру- жы-но- ю, князь з дру- жы- но- ю.

p

ой, ой, князь з дру- жы- но- ю.

p

Ой, е- дуць е- дуць, я- ны і- гра- юць, ніх- то дру-жы- ны

p

Ой, я- ны і- гра- юць, ой,

p

mf

не пе-рай-ма- е.

Та- ды А-лён- ка йдзе пе- рай- ма- е,

mp

дзе пе раймa- е

не пе-рай-ма- е.

дзе пераймае

p

ой

за столсаджа-е

Ў ха- ту ві-та- е за стол са- джа- е. Ой,

за столсаджа е. Ой, бо-рам бо- рам,

Ой

бо- рам ба-ра- ві-но-ю, ой,

ба-ра-ві- но- ю, ба-ра- ві-но-ю. А хто там е- дзе?-

е- дзе князь дружы-но-ю, ой,

Князь дру-жы-но- ю, князь дружы-но-ю. Ой, бо-рам, бо- рам,

ой,

ба-ра-ві-но-ю, ой, князь дружы-но-ю

ба-ра-ві-но- ю. А хто там е- дзе? Князь дру-жы-но- ю.

ой,

Ой, бо-рам, борам, ой,
ой, бо-рам бо-рам,
ой, бо-рам борам, ой,
ой, бо-рам бо-рам,
ten
allargando
ba- ra- vi- ной.
ten
ba- ra- vi- ной.

Вясельная застольная песьня із фальклёрных запісаў Заходняй Беларусі. Тут падаецца апрацоўка песьні для опэры "Лясное Возера"

1. Ой, борам, борам, баравіною, баравіною.
   А хто там едзе? — Князь з дружыною, князь з дружыною.
2. Ой, едуць, едуць, яны іграюць, яны іграюць,
   Ніхто дружыны не пераймае, не пераймае.
3. Тады Аленка йдзе, пераймае, йдзе, пераймае,
   Ў хату вітае, за стол саджае, за стол саджае.
4. Ой, борам, борам і г.д. (першая зваротка).

Позна Сонца


Allegro
f
Поз-на сон- ца
mf
па- за- го-ры за-ха- дзіць позна дзеў-ка па ма-
meno
ма-
Allegro
1. 2. 3.
f
лой-чы-ку ту- жыць.
St
поз-на
Allegro
4
f
жыць.
St

Народная песьня для жаночага ансамблю. У выкананьні яе трэба прытрымлівацца паказаных тэмпаў-зьменаў хуткага (аллегро) і павольных (мэно) рухаў.

1. Позна сонца па-за горы заходзіць,
   Позна дзеўка...па малойчыку тужыць.
2. Позна плакаць, позна плакаць, гараваць
   Пара дзеўка...пара табе забываць.
3. Міл паехаў з казакамі на вайну
   У чужую...чужу-дальню старану.
4. Позна сонца і г.д. (першая зваротка)

Касецкая



Касецкая народная песьня, вельмі характэрная сваімі старадаўнымі прыёмамі строю. Выконваць лепей мужчынскім ансамблем і бяз музычнага акампаніямэнту.

1. Ой...Ой, ў лузе касец косіць,
   Ды ў лузе.
   Ой...Касец косіць ды касіўшы,
   Галосіць.
   Ой...Каса тупа, Ой, чаму жана
   Скупа?
2. Ой...Чаму-ж мая каса тупа,
   Ды чаму-ж?
3. Ой...Каса тупа, тачыць буду,
   Што тупа.
   Ой...Тачыць буду, жана скупа —
   Вучыць буду
4. Ой...Ой, ў лузе касец косіць і г.д. (першая зв.)

Ой,Бору Мой

Moderato

mf Ой, бо-ру мой,

бо- ру мой, ча-му, бо- ру, ня

шу- міш? ну.

1. 2. 3. 4.

Народная лірычная веснавая песьня. Апрацаваная для салёвага (сярэдні голас) альбо унісоннага выкананьня.

1. - Ой, бору мой, бору мой,
Чаму. бору, ня шуміш?

2. - Як мне, бору, ды шумным быць?
У мяне, бору, птушак няма.

3. - Ой, двору мой, двору мой,
Чаму не мяцёны стаіш?

4. - Як мне, двору, мяцёным быць?
У мяне, двору, дзевак няма.

5. Адна была, Марысечка,
Адна была, маладая.

6. Сваты ўзялі на гульню,
Рыгор сабе ўзяў за жану.

Бярозанька



Лірычная народная песьня, адна з найлепшых узораў паводля эмацыянальных і музычна-кампазыцыйных якасьцяў. Апрацованая для жаночага ансамблю.

1. Бярозанька, курчавая, рано,
   Дзе-ж ты свой ліст, дзе падзела, рано?
2. Стаяла я над вадою, рано,
   Ды ськінула яго ў ваду, рано.
3. Дзяўчыначка, маладая, рано,
   Дзе-ж ты красу сваю дзела, рано?
4. Хадзіла я каля броду, рано,
   Ды ськінула красу ўваду, рано.
5. Бярозанька...і г.д. (першая зваротка).

Ой-жа Ты,Сонца



Беларуская жаўнерская народная песьня. Ня гледзячы на заўважныя ўплывы будаваньня салдацкіх песьняў, — у ва многіх рысах захоўвае беларускія асаблівасьці, да таго-ж цікава сваім выкананьнем і адлюстраваньнем пары салдатчыны. Выконваць найлепш мужчынскім ансамблем без суправаджэньня.

1. Ой-жа ты, сонца, ды, сонца я...(а-а)аснае,
   Ды чаго ты ранень(і)ка узыхо...(о-о)одзіла?
2. Ой-жа вы, крас(ы)ныя мало...(о-о)ойчыкі,
   Ды чаго-ж вы ранень(і)ка выхо...(о-о-о)одзілі?
3. Ой, на дубочку ды воран кра...(а)ча на бяду,
   Ой, ды як пагоняць(і) нас мало...ойцаў на вайну.
4. Ой, на вайне той ды востры ша...абелькі зьвіняць
   Ой-жа, з плеч малойчыкаў гало...овачкі ляцяць.

Песьні Лёгкага Жанру

Рыцар Казкі





Павольнае танга із выкарыстаньнем беларускіх народна-песенных зваротаў, на адзін ці два галасы або для жаночага ансамблю. Словы Р. Крушыны.

1. Мой няўміручы Край, мой Край жыве,
Ў сваім цнатлівым харасьцьве.
І я ў ім, я ў ім радасьці таю —
Я Беларусі свой сьпеў пяю.

2. Мне сьняцца, сьняцца нашыя лугі,
Азёраў сініх тых берагі,
Акрытых соннаю, соннай смугой,
Маёй Краіны той дарагой.

3. І ты адтуль, адтуль, мая вясна,
Глядзела сонейкам із вакна
І думку, думку песьціла маю,—
Табе кроў сэрца я аддаю.

4. Твой вобраз, вобраз мілы, твой партрэт,
Як рыцар казкі той амулет,
Па сьвеце у сваім сэрцы пранясу:
Забраны Край мой, Тваю красу.

Ціхі Летні Вечар

Tempo di Valce lento

mp

Ці-хі лет-ні ве- чар, за- цьві- та-юць ру- жы,

p

mf не ад- на дзяў-чы-на па ка- ха-ным ту-жыць, па ка-

mp

ха- ным ту- жыць. Не ў ад- ной дзяў-

mf

чы- ны час- та ве-ча- ра- мі

mf на-бя- га- юць во- чы *p* гор-кі- мі сьля-

за- мі. за- мі.

Павольны вальс із захаваньнем некаторых элемэнтаў беларускага калярыту, для аднаго, двох ці некалькіх жаночых галасоў. Словы У. Клішэвіча.

1. Ціхі летні вечар,
Зацьвітаюць ружы,
Не адна дзяучына
Па каханым тужыць. (2 разы)
Не у адной дзяучыны
Часта вечарамі
Набягаюць вочы
Горкімі сьлязамі.

2. Бягуць, бягуць думкі...
І, нарэшце, устане
Сьветам яснай зоркі
Зь любым час расстаньня. (2 разы)
Уздыхне і скажа:
— У краю тым далекім
Адгукніся словам,
Любы, чарнавокі.

3. Сыпле вецер цьветам,
Адцьвітаюць ружы,
Не адна дзяучына
Па каханым тужыць. (2 разы)
Не у адной дзяучыны
Часта вечарамі
Набягаюць вочы
Горкімі сьлязамі.

Гітара

Moderato assai

mp

Зай-грай, -я гі-ма

Хор

ля- ля,

mf

Та-та-та, та- та- та, та- та- та, ля- ля, Зай-грай ма- я гі-

mp

Ля- ля, ля- ля, ля- ля, ля, ля- ля,

та- ра, хай ўспомню як, бы- ва- ла, ты мне сьпява-ла, А- ла. Даў-

та-та-та, ля- ля, та-та-та, та-та-та, ля-ля,

та- ра, хай ўспомню як, бы- ва- ла, ты мне сьпява-ла, А- ла. Даў-

ля- ля, ля- ля, ля- ля, ля- ля, ля- ля,

но та- ды... Хай ўспомню як, бы- ва- ла, хай ўспом-ню як, бы-
та-та-та, ля-ля. Хай... - ва- - - ла

mp

Хай ўспом-ню як, бы- ва-
но та- ды... ля- ля, хай ўспом-ню як, бы-

mp mp

ля- ля, ля-ля- ля. ля- ля, ля, хай

poco a poco cresc

ва- ла як, бы- ва- ла, ты сьпя-ва-ла мне даў- но, p даў- но та-

mf f p

як, бы- ва- ла, ты сьпя-ва-ла мне даў- но, даў- но та-
ва-ла

ўспомню як, бы-

St p

1. 2. 3.

ды... мой. Зай-грай, зай-грй, гі-та-ра, хай ўспомню як, бы-

та-та-та

ды... мой. Зай-грай, зай-грай гі-та-ра, хай ўспомню як, бы-

ля- ля, ля-ля-ля.

p

p

ten

ва-ла, ты мне сьпя-ва-ла, А- ла, даў- но та- ды. ля- ля.

mf

ва-ла, ля- ля- ля. ля- ля- ля.

mp

ты мне сьпя-ва-ла, А- ла, даў- но та- ды.

mf

Песьня напісаная ў цыганскім духу, можа выконвацца як салёвы раманс для тэнара з фартэп'яна ці як харавая ансамблевая песьня для мяшанага квартэту.*) Можа быць выкарыстаная й для танцу пад павольнае танга.

1. Зайграй, мая гітара,
Хай ўспомню, як, бывала,
Ты мне сьпявала, Ала.
Даўно тады...
Хай ўспомню (і г.д.)

2. Мне помніцца сустрэча
У той апошні вечар,
Калі я разьвітацца
Прыйшоў з табой.
У той апошні вечар (і г. д.)

3. Заплаканыя вочы,
Твой стройны стан дзявочы,
Ты ціха мне сказала:
"О, мілы мой!"
Заплаканыя вочы (і г. д.)
Заграй, заграй, гітара,
Хай ўспомню, як, бывала,
Ты мне сьпявала, Ала.
Даўно тады... Ля-ля.

*)Пачынаецца кожная зваротка зь імітаваньня гукаў гітары: Ля-ля, Та-та-та, на фоне якіх і ідзе сьпеў.

Незнаёмка

Павольнае танга на словы У. Клішэвіча. У акампаніямэнце праходзіць матыў старой беларускай жніўнай песьні.

1. Мы спаткаліся з табою выпадкова,
Час зьнікаў, зьнікаў у вечнасьці хутчэй.
Не прамовіўшы адзін другому слова,
Разьвіталіся загадкаю вачэй.
І калі табе я ў вочы толькі глянуў,
Штосьці нас скавала абаіх.
Глыбіня, прастор і бурнасьць акіяну
Калыхаліся тады ў вачох тваіх.

2. Сёньня я увесь пачуцьцямі ўзьняты,
Ад таго у маім сэрцы не лягчэй,
Што нас, хлопцаў, сабой зманьваюць дзяўчаты
Васільковымі праменьнямі вачэй.
Не забыцца, не, на тую мне хвіліну,
У хвілінах таямніцы ёсьць,
І тады ты падарыла для ўспамінаў
Мне вачэй сваіх жывую прыгажосьць.

Незнаёмка

Tempo di Tango

mp

Мы спат-ка- лі-ся з та-

бо- ю вы-пад-ко- ва, час зьнікаў, зьнікаў у нась веч- ці хут-

чэй. Не пра-мо-віў-шы а-дзін дру-го-му сло- ва,

разь-ві- та-лі-ся за-гад-ка-ю ва- чэй. і ка-

p

лі та- бе я ў во-чы толькі гля-нуў, штось-ці нас ска-

ва-ла а- ба- іх. Глы-бі- ня, прастор і бурнасьць кі-

я- ну ка- лы- ха-лі-ся та-ды ў ва- чох тва-

1. іх.

2. жосьць.

Пакахай


Tempo di Tango lento
Хор
Плы-ве рэч-ка да- лін-кай, ры-бак шмат шмат у
лін-кай, ры-бак шмат шмат у
Плы-ве рэч-ка да-
mp
Плы-ве рэч- ка, ры - бак у
mp
ёй; па- ка-хай жа дзяў-чын-ка, ты, як рыб-кі ру-
ей ры-бак шмат шмат у
чын-ка, ты, як рыб-кі ру-
па-ка- хай-жа, дзяў
ей; у ей па- ка- хай ты

чэй. Без ва-дзіцы-б ні-ко- лі рыб-кі і ня жы-

так як рыб-кіру- чэй ко- лі рыб-кі і ня жы-

як ру- чэй. Без ва-дзіцы-б ні чэй. Без ва-дзіцы б ня- жы-

лі,- без ка-ханьня і до- лі ня- ма

лі,- без ка-ханьня і шчасьця, до-лі ня- ма на зям-

лі,- без ка-хань- ня, шчасьця до-лі ня- ма на зям-

лі, без каханьня ды без ка-хань- ня до- лі ня- ма

лі, зям- лі. Ня- ма зь кім

лі, зям- лі. Ня- ма зь кім

ня-ма на зям- лі, зям- лі. Ня-ма дзя-

FINE

дзяліць го-ра, смутку і па- цех; вы-лі сьлёз

го-

дзяліць ра, смутку і па- цех; смут- ку і па-

го-ра

лі- ці і па- цех; цэ-ла

цэ-ла мо- ра; чу-жым бу- дзе сьмех. хто-ж ка- ха-

цэ-ла мо- ра; чу-жым бу-дзе сьмех. хто-ж ка- ха-

чу-жым бу-дзе сьмех.

мо- ра; бу- дзе сьмех. хто ж ка-

е- зга-да- е, ад- чу- е ду- шой; ня чу-рай-ся, дзяў-

е- зга-да- е, ад- чу- е ду- шой; ня чу-рай-ся дзяў-

е

ха- е у- сёй ду- шой;

mf

чын- ка, сэр-ца мне у-спа- кой. Ой!

ня чу-райся ты сэр-ца ўспа-кой.

чын- ка,

сэр-ца мне у- спа- кой.

Вакальнае танга для дуэту, жаночага ансамблю (верхні радок), ці мяшанага хору з акампаніямэнтам. Словы Я. Купалы (зьвершу: "Пакахай мяне дзяў...")

1. Плыве рэчка далінкай,
Рыбак шмат у ёй;
Пакахай-жа, дзяўчынка,
Ты, як рыбкі ручэй.
Без вадзіцы-б ніколі
Рыбкі і ня жылі, —
Без каханьня і долі
Няма на зямлі.

2. Няма зь кім дзяліць гора,
Смутку і пацех;
Вылі сьлёз цэла мора, —
Чужым будзе сьмех.
Хто-ж кахае — згадае,
Адчуе душой;
Ня чурайся-ж, дзяўчынка,
Сэрца мне ўспакой.

Далей сьпяваецца як ад пачатку, толькі з наступнымі словамі:

3. Разам будзем жыці ў хатцы,
Разам жыць, песьні пець;
Будзе раем здавацца,
І ўсё праўдай ясьнець.
Пакахай-жа ты толькі
Усяею душой, —
Жыцьцё будзе, як кветка,
І у сэрцы спакой.

Сумная Згадка

Tempo di Valse

Сум-на- ю згад-ка-ю. Сум-на- ю згад- ка- ю ста- ла- ся ля ля ля ля ля

ты. ста- ла- ся Дзіў- найза- гад-ка- ю шэп-чуць кус- ты, ля

шэп-чуць

кво- ла і не- ха- ця зво-няць ліст-вой. Не, у тым

так ліст-вой

St щэ-па- це St го- лас ня твой. сты.

не у тым не у тым го-лас ня твой шэп-чуць кус- ты.

Песьня напісана ў тэмпе вальсу для хору бяз музычнага акампаніямэнту, хоць і можа быць дададзены. Словы А. Салаў'я з кнігі "Вянкі". Зьвяртаецца ўвага на падкрэсьліваньне ў выкананьні характару шэпту, звону лісьцяў. У вапошніх словах, "Не, у тым шэпаце" (першая зваротка) і "Дзіўнай загадкаю" (другая зваротка) сьпярша (на першым гуку) робіцца акцэнт, а далей адразу піяна; і гэтак ува ўсіх галасох. У песьні выкарыстаныя народныя звароткі песьні "Палыночак".

1. Сумнаю згадкаю
Сталася ты.
Дзіўнай загадкаю
Шэпчуць кусты,
Квола і нехаця
Звоняць ліствой.
Не, у тым шэпаце
Голас ня твой.

2. (Ля-ля) Вяне, блукаючы,
Восеньскі сум,
Жоўкне, сьціхаючы,
Змучаны шум.
Сумнаю згадкаю
Сталася ты, —
Дзіўнай загадкаю
Шэпчуць кусты.

Туга

Tempo di Tango

mp Аг- ня-мі стан-цы- я га- рэ- ла,

p

і плыў цяг-нік ку-дысьу сьвет. "Бы-вай", ска-за-ла ты ня-

сьме- ла, сха-ваў- шы во- чы ў цень па- век.

Ня ве-даў я, што ўжо ні- ко- лі ця- бе ня ўба-чу у жыць-

ці. Цяг-нік у цем-ры зьнік па- во- лі,

пар-ва- ла ноч між сэр-цаў ніць.

Прыпеў:

mf Сум- на,

ка- лі пры-пом-ню час рас- стань- ня, той чар ка-хань-ня,

па-ца-лун- каў жар. Сум- на па-сьве це між лю-дзей блу-

ten rit

1.

ка- ю, ця-бе шу- ка- ю ды дар- ма.

2.

ма.

mf

Сум- на, па сьве-це

mp

між лю-дзей блу-ка- ю, ця-бе шу- ка- ю ды дар-

ten



Танга.*) Словы Н. Арсеньнявай (пераклад).

1. Агнямі станцыя гарэла,
І плыў цягнік кудысь у сьвет.
"Бывай", — сказала ты нясьмела,
Схаваўшы вочы ў цень павек.
Ня ведаў я, што ўжо ніколі
Цябе ня ўбачу у жыцьці.
Цягнік у цемры зьнік паволі,
Парвала ноч між сэрцаў ніць.

Прыпеў: Сумна, калі прыпомню час расстаньня,
Той чар каханьня,
Пацалункаў жар.
Сумна, па сьвеце між людзей блукаю,
Цябе шукаю,
Ды дарма.

2. Мінаюць дні, мінаюць ночы:
У думцы ты заужды адна,
І толькі сьняцца твае вочы,—
Прасьнешся — ўсё вакол мана.
Ня вернецца маё каханьне,
Ня вернецца мая вясна;
Жыцьце мае плыве, мінае,
Мая-ж туга ня мае дна.

Прыпеў:

*)Для жаночага выкананьня рабіць наступныя зьмены ў словах: "Бывай"— сказаў ты мне нясьмела", "Ня ведала, што ўжо ніколі", "А думка пра цябе адна"...

Да Цябе, Дарагя

Tempo di Tango (lento)

mp

(Andante) Дзень на-хму-рыў ся, пла-ча і жа-ліц-ца.

Ро-дзіць сму-так. Сьляза на вак- не. Чу-ю -

ма- ці пяш- чот- ны- мі паль-ца-мі ці-ха, пры- від-на

лаш- чыць мя- не, *mf* чу-ю ма- ці пяш- чот- ны- мі

mf



Песьня-танга на адзін, два ці некалькі галасоў. Словы Р. Крушыны (з цыклю "Лірыка зь вялікага места").

1. Дзень нахмурыўся, плача і жаліцца.
Родзіць смутак. Сьляза на вакне.
Чую — маці пяшчотнымі пальцамі (2 разы)
Ціха, прывідна лашчыць мяне.

2. Сэрцу мірсьціцца даўнае, роднае.
Толькі боль узрастае удвая:
За паўсьветам,за далеччу воднаю (2 разы)
Ты гаруеш, матуля мая.

3. Душыць крыўда... Ніякімі лекамі,
Не загоіцца смутак душы.
Засьпявай нашы песьні, як некалі, (2 разы)
І за сына малітву скажы.

4. Акіянскія горка-салёныя,
Перамераўшы мілі, вятры
Прынясуць твае словы ў зялёныя (2 разы)
На ўзьбярэжжы сюды — гушчары.

Васількі

Tempo di Tango.

Ў ча-се дня су-па- ко- ю, мы лю-

бі-ліз та-бо- ю пайсьці зо-ла-та жы- та, ў на-шы скры-ты кут-

кі. Зор-кі нам да сьві-тань-ня вар-та-ва-лі ка- хань- не,

ten *rit*

ба-ра-ні-лі пяш-чот- на нас сяб-ры ва-сількі. *mf* О, ва-сіль-

Poco più

кі, сі-ня-во-кі-я крас-кі, сым-баль ці-ха-га шчась-ця

і лю-боў-най па-ры. *f* О, ва-сіль-кі,

квет-кі ка-зач-най лас-кі і блакітных ня-бё-саў

1.2. да-ры. *mf* 3. да-ры.

p *mf*

Танга для солё-сапрана. Словы М. Куліковіча.

1. Ў часе дня супакою,
Мы любілі з табою
Пайсьці ў золата жыта, нашы скрытны куткі.
Зоркі нам да сьвітаньня
Вартавалі каханьне,
Баранілі пяшчотна нас сябры-васількі

Прыпеў: О, васількі, сінявокія краскі,
Сымбаль ціхага шчасьця
І любоўнай пары.
О, васількі, кветкі казачнай ласкі
І блакітных нябёсаў дары.

2. Ты паехаў далёка,
Я сумую глыбока,
У жыцьці я ня маю тваёй цьвёрдай рукі;
Ўсюды бачацца цені,
І ляжаць у сухмені
На стале прад люстэркам, як ўспамін васількі.

Прыпеў:

3. Раптам ліст да абеду,
Дзе ты пішаш: "Прыеду",
Ўсхвалявана лічу я да спатканьня дзянькі,
Мы ізноў ў залатое
Пойдзем жыта густое,
Дзе спаткаюць пяшчотна нас сябры-васількі.

Прыпеў:

Жарты, Гульні й Скокі

А. жарты

Ой,Ня Хочацца Мяне,Моладзі





Жартоўная беларуская народная песьня.

1. Ой, ня хочацца м(я)не, моладзі, ня піці, ня есьці,
   Толькі хочацца м(я)не, моладзі, каля мілага се... (сесьці*)
2. Ой, ня буду-ж я паліць печачку, ня буду я есьці,
   Няма майго, ой, ды міленькага. "Ля каго-ж мне се...(сесьці
3. Я мілога ўсё дажыдалася, сталы засьцілала,
   Ды два кубачкі, два сярэбраных віном наліва...(налівала)
4. А ў гародзе ёсьць ды на градачцы тры калівы мяты,
   Пакахаў мяне мой мілёначак, хоць я не бага...(багата)
5. Ой, ня хочацца і г.д. (першая зваротка).

*) Тут і ў іншых зваротках апошняе слова ў канцы радка, пададзенае ў дужках, не сьпяваецца.

А ў Бары Сасна

Народная песьня апрацованая на сьпеў з канонам: адзін голас дакладна паўтарае той самы матыў крыху пазьней першага. У Беларускім Тэатры Эстрады яна была інсцэнізаваная: выканаўцы разьбіваліся на дзьве групы; пачыналі сьпяваць усе разам тварамі да публікі, а на каноне паварачваліся бокам, тварамі адзін да другога. Канец песьні йзноў сьпяваўся ўсімі тварама да публікі.

1. А ў бары сасна калыхалася,
   Ой, люлі-люлі, калыхалася.
2. (канонам) Дзеўка да маткі, ой, зьбіралася,
   Ой, люлі-люлі, ды зьбіралася.
3. (канонам) Трыма мыламі умывалася,
   Ой, люлі-люлі, ўмывалася.
4. (канонам) Ды ў каралі прыбіралася,
   Ой, люлі-люлі, прыбіралася.
5. (разам) А ў бары сасна калыхалася,
   Ой, люлі-люлі, калыхала...*) (калыхалася)

*)Апошняе слова, як гэта часта бывае ў народным выкананьні не вымаўляецца поўнасьцю, а працягваецца гукам.

А ў Бары Сасна




у- мы- ва- ла- ся, ой,лю-лі-лю- лі, у- мы- ва- ла- ся.
ла- мі у- мы-ва- ла- ся,ой,лю-лі- лю- лі,ой, лю- лі.
А ў ба-ры сос- на ка- лы- ха- ла- ся, ой, лю- лі- лю- лі,
tr
tr
rit
ка-лы-ха- ла...
St
rit
f
a tempo
St

Прамова Свата

Moderato

f А ха- та-жя- го, ха-

та, ўсім ра- да, ўсім ба- га- та: ў сад-ку

у нас-чу- лі?- рас-туць па пу-дзе ду- лі; гу-роч-кі

у га-ро-дзе дык роў- ны- я ка-ло-дзе; а

пчо- лы на- шы, пчо-лы із доб- ра-

га са- ко- ла- на- но-сяць столькі мё- ду, што

склеп наб - еш, як лё-дам; а- веч-кі ў нас, як ко-

ні; ка- ноп- лі, як- са- сонь-

нік... а ўся- го й чыс-та мно- га, дзя- куй Бо- гу...

А ма- ла- ды раз- важ- ны, ра- зум- ны, ад-

allargando

Гаворыць *f*

важ- ны. Вось я- кі наш ма- ла- ды.

f

З апэрэты "У вырай". Сват выхваляе жаніха. Тэкст Н. Арсеньнявай.

А хата-ж яго, хата,
Ўсім рада, ўсім багата:
Ў садку у нас —чулі? —
Растуць па пудзе дулі;
Гурочкі ў гародзе
Дык роўныя калодзе;
А пчолы, нашы пчолы...
Із добрага сакола —
Наносяць столькі мёду,
Што склеп наб'еш, як лёдам;
Авечкі ў нас, як коні;
Каноплі, як сасоньнік...
А ўсяго й чыста многа,
Дзякуй Богу...
А малады разважны,
Разумны, адважны.
(гаворыць) Дасьць лёс з ваўком сустрэцца,
Дык на'т не спалахнецца.
Чарта сустрэне ўночы —
На'т не апусьціць вочы.
(пяе) Вось які наш малады.

Ой З-пад Лесу

Народная песьня, выкарыстаная ў опэры "Лясное Возера" як песьня скамарохаў. Парадак выкананьня такі: 1-ю й 2-ю звароткy пачынаюць барытоны й басы. Прыпеў цэлы час застаецца аднолькавым у тэмпе алегра, толькі для канца, пасьля пятае звароткі, дадзены асобны вар'янт. Удача песьні залежыць ад утрымліваньня кантрасту паміж больш павольным запевам песьні і вельмі хуткім, амаль гаворкаю, прыпевам.

1. Ой, з-пад лесу,
Ой, з-пад тыну, ох-ой.

Прыпеў: Ой, з-пад лесу, ой, з-пад тыну,
Гоп, та-ра-ра, рым-бом-бом,
Відаць места палавіну,
Гоп,та-ра-ра, рым-бом-бом.

2. Там дзяўчына
Ваду брала, ох-ой.

Прыпеў: Там дзяўчына ваду брала,
Гоп, та-ра-ра, рым-бом-бом,
Ды з Раманам размаўляла,
Гоп, та-ра-ра, рым-бом-бом.

3. Раман, Раман,
Раманачка, ох-ой.

Прыпеў: Раман, Раман, Раманачка,
Гоп, та-ра-ра, рым-бом-бом.
Пусьці мяне дадомачку,
Гоп, та-ра-ра, рым-бом-бом.

4. Будзе маці
Біць, журыці, ох-ой.

Прыпеў: Будзе маці біць, журыці,
Гоп, та-ра-ра, рым-бом-бом,
Каб з табой не гаварыці,
Гоп, та-ра-ра, рым-бом-бом.

5. Раман дзеўку
Намаўляе, ох-ой.

Прыпеў: Раман дзеўку намаўляе,
Гоп, та-ра-ра, рым-бом-бом,
Ажаніцца абяцае,
Гоп, та-ра-ра, рым-бом-бом.

Ой з-пад Лесу


Moderato
mf
Ой, з-пад ле-су, ой, з-пад ты-ну,
f
Allegro
f ох, ой.
Ой, з-пад ле- су, ой, з-пад ты- ну,
8va
Прыпеў:
Staccato
ой
гоп, та- ра- ра, рым-бом- бом, ві- даць мес-та па- ла- ві- ну,


1.2.3.4.
Moderato
гоп, та- ра- ра,
рым- бом- бом.
Пачатак, 3,4 звар.
mf
dolce
1. Ра-ман, Ра- ман,
2. бу-дзе ма- ці
Ра- ма- нач- ка,
біць жу - ры - ці,
ох,
ой.
Прыпеў:
5. для канца
rit
рым-
бом-
бом.
5.
rit

Ой, у Лесе, Пры Гушчары



гэй, гэй, гэй, гэй. о- - ой

Дуб да ду- ба на- хі- ліў- ся,

о - ой, ой, гэй, на-хі- ліў- ся,

ка- ма- рок з ду- ба зва- ліў- ся;

ой, гэй, ды зва- ліў-ся. Ля-ціць му- ха ра- та-ва- ці,

ва-дой го- лаў аб- лі- ва- ці, ой, ой, ой, ой, ой.

f Па- ха- вайце цём-ле- ся, пры зя- лёненькім га-рэ- се,
ў-ным

f

гэй, гэй, гэй, гэй, гэй, *ff* гэй.

8va 8va

ff



Скарочаны і спрошчаны ўрывак з опэры "Лясное Возера" для мужчынскага дуэту, ансамблю ці хору. Словы ўзятыя з народнай песьні "Ой, у лесе пры гушчары". У музычную аснову ўзятая народная дажынкавая посьня "А ў нашага Севасьцея доўга барада".

1. Ой, у лесе, пры гушчары,
Калыхаліся камары;
Гэй, Гэй пры гушчары,
Гэй, гэй ды камары, гэй, гэй, гэй, гэй.
Дуб да дуба нахіліўся,
Камарок з дуба зваліўся;
Ой, гэй, нахіліўся,
Ой, гэй, ды зваліўся.
Ляціць муха ратаваці, (тэнары)
Вадой голаў абліваці, (басы)
Ой, ой.
2. Ой, няма ўжо мне ратунку,
Паміраю, мая кумка;
Гэй, гэй мне ратунку,
Гэй, гэй, мая кумка. гэй, гэй, гэй, гэй.
Камарочак, родны браце,
Дзе-ж цябе мне пахаваці;
Ой, гэй, родны браце,
Ой, гэй. пахаваці?
Не хавайце пры даліне, (тэнары)
Там вырыюць мяне сьвіньні, (басы)
Ой, ой.
3. Пахавайце ў цёмным лесе,
Пры зялёненькім гарэсе,
Гэй, гэй, гэй, гэй.

Цераз Сад-вінаград

Allegro

I. Це-раз сад ві-на-град, па ва-ду ха дзі- ла.
2. Ой, у - зяў мя-не той, ка-го я ня зна- ла-

f

I. Ча-му-ж мя-не той ня ўзяў, ка-го я лю- бі- ла, ча-му-ж мя-не
2. ўсё за ты-я пе- ра-бо-ры, што пе- ра-бі- ра- ла, ўсё за ты-я

I. той ня ўзяў, ка- го я лю- бі- ла?
2. пе-ра-бо-ры, што пе- ра- бі- ра- ла.

meno

і ка-пус- тка ма- я, і ліс-точ- кі ма- е-
і ка-пус- тка ма- я, і ка чань- нее ма- е;

mp

tr

meno

Allegro

2. ма-ла-да- я дзяў- чы-нач-ка і ка- хань- не ма- е,
1. дзе мой мі-лы па - ха-джа-е, там і воч - кі ма- е,

Ой і ка- хань- не ма- е.

Allegro molto

там і воч- кі ма- е. Це-раз сад- ві- на-град па ва-ду ха-

дзі- ла. Ча- му-ж мя-не той ня ўзяў, ка-го я лю- бі- ла,



Беларуская народная песьня.

1. Цераз сад-вінаград
Па ваду хадзіла.
Чаму-ж мяне той ня ўзяў, (2 разы)
Каго я любіла.

2. Ой, ўзяў мяне той,
Каго я ня знала —
Ўсё за тыя пераборы, (2 разы)
Што перабірала.

3. І капустка мая,
І лісточкі мае,
Дзе мой мілы пахаджае,
Там і вочкі мае. (Ой, ой, там і вочкі мае)

4. І капустка мая,
І качаньне маё;
Маладая дзяучыначка
І каханьне маё. (Ой, ой, і каханьне маё)

5. Цераз сад-вінаград
Па ваду хадзіла.
Чаму-ж мяне той ня ўзяў,
Каго я любіла,
Чаму-ж ня ўзяў?

Усё,Як Трэба

Con moto

Ма- ю я, зда- ец-ца ўсё, як трэ- ба,-

но-гі,ру- кі, хле- ба і да хле-ба; ма-ю сэр-ца, не раў-ну-ю-

чы,як зь мё-ду; ўба-чу дзеў-ку -так вось хо-ды- рам і хо- дзіць,

ой, і хо- чац-ца мне, люд-цы, а- жа- ніц-ца,
да дзяў-чын- кі ма- ла- дзень-кай пры ту- ліц-ца,

тр

ой, і хо- чац- ца дзе-так да- га- да- ва- ці, каб і тут і

f

(гаворкаю)

та- ма- ка чуць: "та- та" Эх, На- сту- леч- ка,

f

ўсё ёй гу- ляч- кі, з у- ся- го я- на сьмя- ец- ца,

а ў мя- не аж тут-ка ны- е, ўсё тра- сец- ца,

да- лі Бог.

Камічная песьня няўдалага жаніха Сьцяпана з апэрэты "У вырай". Тэкст Н. Арсеньнявай.

1. Маю я, здаецца, ўсё, як трэба,—
Ногі, рукі, хлеба і да хлеба;
Маю сэрца, не раўнуючы, як зь мёду;
Убачу дзеўку — так вось ходырам і ходзіць,
Ой, і хочацца мне, людцы, ажаніцца,
Да дзяўчыны маладзенькай прытуліцца,
Ой, і хочацца дзетак дагадаваці,
Каб і тут і тамака чуць —"тата".

Эх, Настулечка,
Ўсё ёй гулячкі,
З усяго яна сьмяецца,
А ў мяне аж тутка ные, ўсё трасецца.
Далі Бог.

2. А мо' кпіць яна зь мяне на жарты,
Дзеўкі-ж гэта ўсё народ упарты;
Мо' яна мяне у тайнасьці кахае,
Па красе маёй хлапецкай уздыхае.
Ой, і хочацца-ж мне зь ёю ажаніцца,
І душой і ўсім да любкі прытуліцца,
Ой, і хочацца дзетак дагадаваці,
Каб і тут і тамака чуць —"тата".

Эх, Настулечка,
Ўсё ёй гулячкі,
З усяго яна сьмяецца
А ў мяне аж сэрца ные, ўсё трасецца.
Далі Бог.

Я у Бацькі Ишчэ Была

Allegretto

f

Я у баць-кі йшчэ бы-ла, ды ня спа- ла, із хлап-ца-мі ноч у но-чач-ку гу-ля - ла. Ад-ну ноч- ку зь Я- гор-кам, а дру-гу- ю з Ры- гор-кам, трэ-цю- ю з Пят-ром,



Лесьня Кацярыны з апэрэты "У вырай". Тэкст Н. Арсеньнявай.

1. Я у бацькі йшчэ была, ды ня спала,
Із хлапцамі ноч у ночачку гуляла.
Адну ночку зь Ягоркам,
А другую з Рыгоркам,
Трэцюю зь Пятром. (2 разы)

2. Аддаў бацька мяне замуж за Андрэя.
Глянь! А ён і цалавацца на'т ня ўмее.
Ні у вочкі, ні ў броўкі,
Ні у русу галоўку,
Ні у белы твар. (2 разы)

3. Ой, Андрэйка мой дурны, недарэка,
Узяла цябе ўсё-ж трасца ды навекі.
Зноў цьвіту я і годзе,
Як той мак у гародзе,
На сваю бяду. (2 разы)

4. І ізноў я не магу ночкай спаці,
Із хлапцамі йду на вуліцу гуляці.
Адну ночку зь Ягоркам,
А другую з Рыгоркам,
Трэцюю зь Пятручком (2 разы), зь Пятром.

А Дзе Я Радзілася-Ня Была

Allegro

f

А дзе ра- дзі- ла- ся, ой, ня бы-

ла. Ку-ды мя-не цём- на ноч пры- вя- ла?

1. 2. 3. 4.

5.

rit

ноч пры- вя- ла?

rit

a tempo

Народная песьня з рэпартуару Беларускага Тэатру Эстрады у Нямеччыне.
Можа выконвацца адным ці двума галасамі або жаночым ансамблем.*)

1. А дзе радзілася — ня была.
   Куды мяне цёмна ноч прывяла?
2. Ой, пад калінкаю спаць лягла,
   Ды калінку ножкаю кранула.
3. Калінку ножкаю кранула,
   На мяне ды расіца капнула.
4. На маю пасьцельку белую,
   На маю ды галоўку бедную.
5. А дзе радзілася...і.г.д. (першая зваротка).

*) Першыя чатыры звароткі сьпяваюцца ў хуткім тэмпе й бяз супынку, 5-я зваротка — яшчэ хутчэй, потым абрываецца на паўзе, ідзе адзін тахт паволі, а на канцы йзноў хуткім тэмпам.

А Я З Хлопцам Стаяла

Allegro moderato

f

А я з хлоп-цам ста-я- ла, ды на хлоп- ца мар-га- ла,

толь-кі я я- му, хлап-цу ма-ла- до-му, праў-дань-кі не ка-за-ла.

1. 2. 3.



Народная песьня.

1. А я з хлопцам стаяла
Ды на хлопца маргала,
Толькі я яму,
Хлопцу маладому,
Праўданькі не казала.

2. Пажджы, хлопец, гадзіну,
Пажджы, хлопец, другую,
Пакуль я сваёй
Роднай матулечцы
Вячэраньку згатую.

3. Вячэраньку згатую,
Пасьцель белу пасьцялю,
Тады да цябе,
Хлопца маладога,
На параданьку пайду.

4. — Табе, дзеванька, нішто,
Па сьвятліцы ходзячы,
А мне, хлопцу,
Хлопцу маладому,
На марозе стаяці. Ой!

Камічны Дуэт

Allegretto

Яна

Як ня-ма мяд- ку ці бра- гі,

f

кіс-лым ква- сам гна- ці сма-гу вы- па- да- е,

Ён

Яна

вы- па- да- е.

Ён

Як ня- ма ка- го ка- ха- еш,

8

Яна

дык ка- ха- еш ка-го ма- еш, ка- го ма- еш,

Яна

Эх, ка-лы- ша ве- цер

Ён

ка- го ма- еш.

Яна

вець-це, нам ніш-то са-бе жы- вец- ца: хай на нас што

Ён

Яна

хо-чуць ва-ляць а, на- рэш-це, не бя-да,

Ён

ма- ем гро-шы, ма- ем са-ла,

Яна

па-рась- це хай ле- бя- да, па-рась- це хай ле- бя-

Ён

tr

tr

Яна

1. 2. 3.

да. О -ой

Ён

f

Дуэт Кацярыны й Сьцяпана з апэрэты "У вырай". Тэкст Н. Арсеньнявай. *)

Кацярына: Як няма мядку ці брагі,
Кіслым квасам гнаці смагу...

Сьцяпан: Выпадае,

Кацярына: Выпадае.

Сьцяпан: Як няма каго — кахаеш
Дык кахаеш, каго маеш,

Кацярына: Каго маеш.

Сьцяпан: Каго маеш.

Прыпеў: (разам) Эх, калыша вецер вецьце,
Нам нішто сабе жывецца:
Кацярына: Хай нанас што хочуць валяць,

Сьцяпан: Маем грошы, маем сала,

Разам: А, нарэшце, не бяда,
Парасьце хай лебяда,
Парасьце хай лебяда.

Кацярына: Сёньня з тым, а заўтра з гэтым,
Сумаваць ня час улетку,

Сьцяпан: Ў сенаваньне,

Кацярына: Ў сенаваньне.

Сьцяпан: Далі Бог, зь яе дзяўчына,
Як вагонь, дарма што кпіны,

Кацярына: Насьміханьні,

Сьцяпан: Насьміханьні.

Прыпеў (разам):

Кацярына: Прытуліся, пацалую
У галоўку у рудую, (цалуе)

Сьцяпан: У даўгі насок,

Кацярына: У даўгі насок.

Сьцяпан: Эх, цалуе, дык цалуе,
Ажна млосьць у сэрцы чую,

Кацярына: Увесь чыста змок,

Сьцяпан: Увесь чыста змок.

Прыпеў (разам):

*) Дуэт лепш за ўсё выконваць у строях пры дэкарацыі вясковага пэйзажу. На прыпеве робяцца скочныя рухі.

Прыпеўкі

Allegretto

mf

Як у нас, так у вас у-сё по-ле роў- на; Як у нас,

так у вас на ву-лі-цы поў- на, ой.

для паўтарэньня

для канца

ПРЫПЕЎКІ.

(варыянт першы)

1. Як у нас, так у вас
Усё поле роўна;
Як у нас, так у вас
На вуліцы поўна, ой.

2. Як у нас, так у вас
Усе мы харошы;
На тысячы — дзяцюкі,
Дзеўкі па тры грошы, ой.

3. А на гары дуб, дуб,
Дубовая лазьня;
Не аддавай, татачка,
За такога блазна, ой.

4. Дрэнь, дрэнь — ня курчаткі,
Яны крупы не бяруць;
Дурні, дурні — не малойцы,
Мне спакою не даюць, ой.

5. Ой, чок, чабаток,
Халява дзірава.
— За што хлопцы дзеўку любяць?
— Каса кучарава, ой.

6. А ў гародзе на градзе
Тры калівы бобу;
А хто дзеўку пацалуе —
Ня выжыве году, ой.

7. Ой, ў гародзе на градзе
Тры калівы мяты;
Кахай мяне, прыгожанькі,
Хоць я не багата, ой.

8. Рэдзьку саджу, рэдзьку сею,
Рэдзьку паліваю;
Майго Яначку кахаю,
Яго-ж выглядаю, ой.

9. Я ня буду рэдзьку сеяць,
Кажуць людзі — горка;
Я ня буду жаніціся —
Будзе біці жонка, ой.

10. Ела, ела саладуху
Ды абкапалася,
Выйшла замуж за старога
Ды й наплакалася, ой.

11. Ой, сяку, сяку я дровы,
Ажна трэскі ў лес лятуць;
Аддай мяне, матулечка,
Куды вочанькі вядуць, ой.

12. Кіну кужаль на паліцу,
Няхай мышы трубяць,
Сама-ж выйду на вуліцу —
Няхай хлопцы любяць, ой.

13. У гародзе капусьцінка,
Шырокі лісточак;
Хто гарэліцы ня п'е —
Баліць жываточак, ой.

14. Ой, не сам гармонік грае —
Пальчыкі вучоныя;
Не сам любы прыцягае —
Яго вочкі чорныя, ой.

15. Нашто бабе рэшата,
Нашто бабе сіта;
Як дзед бабу пацалуе,
Стане баба сыта, ой.

16. Не хадзі ты да мяне
Ды не заляцайся,
Не пайду я за цябе,
Ты не спадзявайся, ой.

17. Каля ямкі хадзіў,
Ды у ямачку упаў,
Любіў мяне, прыгожую,
Ды плюгаўку замуж ўзяў, ой.

18. А хто чарачку п'е,
Таму-ж налівайце;
Хто гарэліцы ня п'е,
Таму не давайце, ой.

19. Не паліла сяньня хаты
Ды й паліць ня буду,
Сяду я каля вакенца,
Міла чакаць буду, ой.

20. Сама хату я паліла,
Сама вымятала;
Сама міла палюбіла,
Сама-ж высватала, ой.

21. Не хадзі-ж ты па гразі —
Па калені ўгразьнеш;
Мусіць, ты мяне ня возьмеш,
Адно толькі дражніш, ой.

22. У гародзе на градзе
Два качаны ўюцца;
А за мяне, маладую,
Два малойцы б'юцца, ой.

Прыпеўкі

Allegretto

Ой, ска-ка-ла баб-ка з ра-кам, а пят- руш- ка

mf

з пас-тэр-ня-кам, а мар-коў-ка з час-на- ком крас-на дзеў- ка

(уга!)

зь дзя-цю-ком, ой.

ПРЫПЕЎКІ.

(варыянт другі)

1. Ой, матачка, матачка,
Любіць мяне Яначка,
Пусьціў коні ён у лес;
А сам да нас ў хату ўлез.

2. Ой, мамачка, мамачка,
Вабіць мяне Яначка,
Я-ж яму гаршчок масла,
Каб хадзіў ка мне часта.

3. Суха, суха напакосе,
Сіні вочы у Антося;
Мяне ўчора мамка біла,
Каб Антося ня любіла.

4. Ты дзяўчынка мая люба,
Праклятая твая губа —
Набрахала на мяне,
Што хадзіў я да цябе.

5. Бадай цябе йндык стаптаў,
Як ты мне хвартух падраў;
Гэта-ж мне татка купіў.
Каб мяне Пятрусь любіў.

6. А ў карчомку за сялом
Прыйшла жонка з памялом;
Досыць, муж, гарэлку піць,
Хадзі збожжа малаціць.

7. Ой-жа грайце вы, музыкі,
Мае лапаткі вялікі,
Анучы валочацца,
Мне скакаці хочацца.

8. Бяз музыкі, бяз дуды,
Ходзяць ножкі ня туды;
А як дудку пачуюць,
Самі ногі танцуюць.

9. А, скрыпачка, далі Бог,
Не шкадуй-жа маіх ног;
Мае ножкі не баляць,
Яны хочуць пагуляць.

10. А дзе дзевачак я чую,
Тамака і заначую;
А дзе дзевак ня чуваць,
Там і мне ужо ня бываць.

11. Не паеду я па дровы,
Мая жонка чарнаброва,
Буду ў хаце сядзеці
Ды на жонку глядзеці.

12. Як у нас вось на Дзяды
Здарыліся дзьве бяды:
Што дзед бабу цалаваў
Ды палаці праламаў.

13. Ой, памер-жа мой харошы,
Мне пакінуў торбу грошай,
Каб я піла, гуляла,
Ды яго ўспамінала.

14. Ня йдзі, дзеўка, ды да тыну,
Бо я цябе перакіну,
Перакіну я цябе,
Што ня любіш ты мяне.

15. Па дарозе каціласа,
Жаніхамі хваліласа:
У каго адзін, ў мяне два,
Чарнабрывы абодва.

16. Ні хатанькі, ні сяней,
Сядзець жонцы весялей;
Ні кароўкі, ні каня —
Сядзі сабе, як паня.

17. Ах ты, дзеванька мая,
Чорнабрывая мая,
Ой, я за твае-жа косы
І застаўся голы, босы.

18. А музыка ў скрыпку граў,
Да канца не даіграваў,
Бадай зь цябе, скрыпака,
Чорт-бы скуру ўсю садраў.

Прыпеўкі

Allegretto

mf

Су- ха се-на на па- ко-се. Сі-ні во- чы у Ан- то- ся. Мя- не ўчо- ра ма- ма бі- ла, каб Ан- то- ся ня лю- бі- ла.

ПРЫПЕЎКІ

(варыянт трэці)

Словы для трэцяга музычнага варыянту зьмешчаныя ў варыянце другім

Б. Гульні

Мост





Словы гульні народныя, а мэлёдыя напісаная ў характары беларускай народнай песеннасьці. Дзяўчаты становяцца ў рад і бяруцца за рукі. Дзьве зь іх выходзяць наперад, становяцца тварамі адна да другое й, узяўшыся за рукі, ствараюць МОСТ, праз які мусяць прайсьці ўсе ўдзельнікі гульні.

УСЕ: — Явар, явар, яваравы людзі, (2 разы)
Чаго вы стаіце, яваравы людзі? (2 разы)
МОСТ (дзьве дзяўчыны): — Мы тут, мы тут,
Мы тут стаімо,
Мост той, мост той, (на той-жа матыў)
Мост падаемо,
Ой, зялёны явар, мост падаемо (2 разы)
УСЕ: — Явар, явар, яваровы людзі, (2 разы)
Усіх прапусьціце праз становы мосту. (2 разы)
МОСТ: — Мы тут, мы тут
Мы тут стаімо,
Мост той, мост той,
Мост падаемо,
Усіх мы прапушчаем, адну пакідаем. (2 разы)

Мост (дзяўчаты) падымае рукі, робячы браму, і ўсе пад сьпеў праходзяць праз мост. Перад апошняй дзяўчынаю брама зачыняецца, і яна застаецца на другім баку. Гульня пачынаецца йзноў, аж пакуль усе ня будуць затрыманыя.

Кума-ж Мая, Кумачка



Кум :

Ча- му-ж мя- не ў гось- цей- кі не за- веш,

Хор:

ой- не за- веш?

Кума:

Та- ды ця- бе ў гось- цей-кі па- за-ву, па-за- ву,

Хор:

Кума:

як но- ву- ю ха- тань-ку збу- ду- ю,

Хор:

ой, збу- ду- ю.

Хор:

для канца

f Ку- ма-ж ма- я, ку мач- ка, дзе жы- веш,

Ку- ма-ж ма- я, дзе жы- веш,

f

ой

ча- муж мя- не ў гось-цей- кі не за-веш,

ой

rit molto

ча- муж мя- не

f

ў гось -цей-кі, не за- веш?

pin

Народная абрадава-хрысьціянная песьня з карагодам-гульнёю. Яна добра надаецца да сцэнічнага выкананьня з ролямі КУМЫ (мэцца-сапрана), КУМА (бас, барытон) і хору. Пачынаецца карагодам зь пя'яньнем першае звароткі ўсімі. У канцы першае звароткі карагод становіцца ў рад тварам да публікі, а зь яго вылучаюцца КУМА й КУМ, якія й вядуць свой дыялёг на скочных рухах. Прышевы пяе хор, разьбіваючыся на жанчынаў, што акружаюць КУМУ, і на мужчынаў, што акружаюць КУМА. Апошні прыпеў паўтараецца колькі разоў і на ім ідзе падвойны карагод: кола жанчынаў-усярэдзіне, кола мужчынаў-звонку. Песьня звычайна пераходзіць у скокі з прыпеўкамі.

Хор: Кума-ж мая, кумачка, дзе жывеш,(2 разы)
Ой, дзе жывеш?(2 разы)
Кум: Кума ж мая, кумачка, дзе жывеш?(2 разы)
Мужчыны: Дзе жывеш?

Кум: Чаму-ж мяне ў госьцйекі не завеш?(2 разы)
Хор: Ой, не завеш.(2 разы)
Кума: Тады цябе ў госьцейкі пазаву,(2 разы)
Жанчыны: Пазаву.
Кума: Як новую хатаньку збудую,(2 разы)
Хор: Ой, збудую.(2 разы)
Кума: Я збудую хатаньку ля вады,(2 разы)
Жанчыны: Ля вады
Кума: Із тоўстага дзерава, зь лебяды,(2 разы)
Хор: Ой, лебяды.(2 разы)
Кум: (сьпявае тое самае, што ў першай звартцы із тымі-ж рэплікамі хору)
Кума: Тады цябе ў госьцейкі пазаву,
Жанчыны: Пазаву,
Кума: Як сьвежае рыбанькі навару,(2 разы)
Хор: Ой, навару.(2 разы)
Кума: А сьвежая рыбанька-акунёк,
Жанчыны: Акунёк;
Кума: Хадзі ка мне ў госьцейкі, куманёк,(2 разы)
Хор: Ой, куманёк.(2 разы)
Хор: Кума-ж мая, кумачка і г.д.

Ах, Сею-ж Мой, Вею

Народная карагодная гульня. Хлапцы й дзяўчаты ладзяць кола, у сярэдзіне "Дзед". Карагод рухаецца й сьпявае:

Карагод: Ах, Сею-ж мой, Вею, (2 разы)
Паеду жаніціся. (2 разы)
А каго-ж мне браці (2 разы) ? Ой !
Ці тую распрапаху,
Ці тую няўмываху? Ой!
Дзед: (гаворыць да аднэй із дзяўчатаў)—Дзеўка, хадзі за мяне замуж: ня будзеш ні прасьці, ні ткаці, толькі будзеш пасьцельку слаці. Адна зь дзяўчатаў выходзіць на сярэдзіну кола да дзеда і бярэцца за яго ззаду, абыймаючы ў поясе)
Карагод: (ізноў ходзіць і пяе)—Ах, Сею-ж мой, Вею
Дзед: (гаворыць тое самае, што й раней, да другое дзяўчыны; тая таксама ўваходзіць у сярэдзіну кола й абхоплівае ззаду першую дзяўчыну; гэтак ідзе аж дэтуль, пакуль усе дзяўчаты ні перачапляюцца за дзеда; тады ўсе сьпяваюць:
Усе: Ах, Сею-ж мой, Вею. (2 разы)
Паеду разжанюся. (2 разы)
Ой, кіну-ж я, рыну (2 разы)
Ды жаніцьбачку сваю (2 разы),ой!
Дзед: (кашляе)
Дзяўчына: тая, што з самага заду, пытаецца ў дзеда —Дзед, а дзед. Чаго ты кашляеш?
Дзед: —Бо стары.
Дзяўчына: А навошта-ж ты мяне маладую браў?
Дзед: чапялою праганяе дзеўку з прычэпу, і тая становіцца ў карагод
Карагод: пяе апошняю зваротку Ах, Сею-ж мой, Вею... Ой, кіну-ж я,рыну... тады йзноў ідзе такі самы дыялёг паміж "дзедам" і наступнай ад краю дзяўчынай, аж пакуль дзед не прагоніць із кола ўсіх дзяўчатаў.

Ах, Сею-ж Мой, Вею

Moderato assai

Ах, Се- ю-ж мой, Ве- ю,

Ах, Се- ю, Ве- ю,

mf

ах, Се- ю-ж мой, Ве- ю, ой,

ах, Се- ю, Ве- ю, па- е- ду жа- ні- ці-ся,

ой

ой.

для канца

па- е- ду жа- ні- ці-ся.

f

Дзед і Баба

Moderato con moto

Баба:

mf

А ка-лі-ж ты пам- рэш, мой дзя- док,

mp

Дзед:

а ка-лі ж ты пам- рэш, га- лу- бок? У се-ра-ду, баб- ка,

у се-ра-ду, люб- ка, у се-ра-ду, шы-за- я га- луб-ка ма-

Разам:

f

я, у се-ра-ду, баб- ка, у се-ра-ду, люб-ка, у се- ра-ду,



Жартоўная народная сцэнка — дыялёгу паміж "дзедам" і "бабаю". Яна надаецца да тэатралізаванага выкананьня. У Беларускім Тэатры Эстрады ў Нямеччыне "дзед" і "баба" йшлі ў выглядзе беларускага лубка: на коўдры нашываліся мінятурныя фігуры "дзеда" й "бабы" з прарэзам дзірак для галоў двух выканаўцаў. Іншыя дзьве асобы, якія стаялі ззаду "дзеда" й "бабы", рабілі камічныя рухі штучнымі нагамі "дзеда" й "бабы" адпаведна тэксту песьні, а пасьля ўсяго тэксту йшлі камічныя скокі "дзеда" й "бабы".

БАБА:— А калі-ж ты памрэш, мой дзядок?
А калі-ж ты памрэш, галубок?
ДЗЕД:— У сераду, бабка, у сераду, любка,
У сераду, сізая галубка мая. *)
БАБА:— Зь кім-жа застануся, мой дзядок,
Зь кім-жа застануся, галубок?
ДЗЕД:— Зь дзевярыкам, бабка, зь дзевярыкам, любка,
Зь дзевярыкам, сізая галубка мая.
БАБА:— Дзевер будзе біцца, мой дзядок,
Дзевер будзе біцца, галубок.
ДЗЕД:— Бараніся, бабка, бараніся, любка,
Бараніся, сізая галубка мая.
БАБА:— Чым-жа бараніцца, мой дзядок,
Чым-жа бараніцца, галубок?
ДЗЕД:— Кіечыкам, бабка, кіечыкам, любка,
Кіечыкам, сізая галубка мая.
БАБА:— Дзе-ж кіёчак ўзяці, мой дзядок,
Дзе-ж кіёчак ўзяці, галубок?
ДЗЕД:— У лясочку, бабка, у лясочку, любка,
У лясочку, сізая галубка мая.
БАБА:— Чым-жа яго секці, мой дзядок,
Чым-жа яго секці, галубок?
ДЗЕД:— Тапорыкам, бабка, тапорыкам, любка,
Тапорыкам, сізая галубка мая.
БАБА:— Дзе-ж тапорык ўзяці, мой дзядок,
Дзе-ж тапорык ўзяці, галубок?
ДЗЕД:— У каваля, бабка, у каваля, любка,
У каваля, сізая галубка мая.
БАБА:— За што-ж яго ўзяці, мой дзядок,
За што-ж яго ўзяці, галубок?
ДЗЕД:— За грошыкі, бабка, за грошыкі, любка,
За грошыкі, сізая галубка мая.

*) Словы "дзеда" пасьля ягонага сьпеву паўтараюцца разам "дзедам" і "бабаю", як гэта паказана на нотным прыкладзе. У выпадку, калі да "дзеда" й "бабы" дадаецца ансамбаль ці хор, словы "дзеда" паўтараюцца ўсімі ўдзельнікамі.

Канапелькі

Moderato

Ой, ча- му вы, ка-на- пель- кі,

не зя-лё-ны ста-і- цё; ой,лю-лі, лю- лі, ой, лю- лі,лю- лі,

не зя- лё- ны ста- і- це? Ой!

Народная карагодная гульня. Павольна рухаецца карагоднае кола. У сярэдзіне кола можа быць адна дзяўчына — запявальніца, якая пачынае зваротку, а ўсе іншыя падхопліваюць ад словаў "Ой, люлі". Словы карагода-гульні народныя, а мэлёдыя скампанаваная паводля народных песенных звароткаў.

1. Ой, чаму вы, канапелькі, не зялёны стаіце;
   Ой, люлі, люлі, не зялёны стаіце?

2. Як-жа нам, ды канапелькам, ды зялёным стаяці;
   Ой, люлі, люлі, ды зялёным стаяці?

3. Зьверху нас, ой, канапелек, клююць моцна вераб'і;
   Ой, люлі, люлі, клююць моцна вераб'і?

4. Ой, са споду канапелькі вада з рэчкі падмыла;
   Ой, люлі, люлі, вада з рэчкі падмыла;

(сьпяваецца ўсімі)

5. Ой, чаму-ж ты, дзяўчыначка, невясёлая ў танку;
   Ой, люлі, люлі, невяселая у танку?

6. Ох, ды як-жа мне вясёлай у танку ды стаяці;
   Ой, люлі, люлі, у танку ды стаяці?

7. Бацька кажа, што за князя мяне будзе аддаваці;
   Ой, люлі, люлі, мяне будзе аддаваці?

8. Мамка кажа, каб ішла я ў чорныя чарніцы;
   Ой, люлі, люлі, у чорныя чарніцы.

Ах Вы,Кумачкі Мае



Танец



Народная гульня із скокамі. Надаецца да сцэнічнага, тэатралізаванага выканаўня. Дзеючыя асобы: Кума (мэцца-сапрана) і сяброўкі-кумачкі (жаночы ансамбаль). Дзея адбываецца каля студні, куды прышлі кумачкі па ваду.

КУМА: Ах вы, кумачкі мае,
Вы, галубачкі мае,
Люлі, люлі люлі, люлі, люляшы.

КУМАЧКІ (прыпяваюць і падскокваюць): Люлі,
люлі, люлі, люлі, люляшы, ой.

КУМА: Выхадзеце на вуліцу,
Гаварэце пасловіцу,
Люлі....і.г.д.

КУМАЧКІ: (прыпяваюць і падскокваюць)

КУМА: Гаварэце пасловіцу —
Чые мужы харошыя,
Люлі....і.г.д.

КУМАЧКІ: (прыпяваюць і падскокваюць)

КУМА: А вось мой старычышча
Ня пушчае на ігрышча,
Люлі....і.г.д.

КУМАЧКІ: (прыпяваюць і падскокваюць)

КУМА: Вазьму старога з сабою,
Ды ў палонку галавою,
Люлі....і.г.д.

КУМАЧКІ: (прыпяваюць і падскокваюць)
(Пасьля йдзе агульны танец)

Падушачка


Moderato
mf
Па- ду- шач -ка, па- ду- шач- ка
ма- я пу- ха- ва- я. Ма- ло- дач -ка, ма- ло- дач -ка,
ой, ды ма- ла- да- я.
f
для канца


1. У та-ноч- ку хло- пец ска- ча,
2. Ка- го люб- лю, ка - го люб- лю,
3. Мя- не,мо - лад-ца , ка - ха - ла,
f Лё- лё , лё- лё
f
1. дзеў-ку крас-ну- ю у- ба- чыў.
2. ту- ю, ту- ю па- ца- лу- ю,
3. ой, ды па- по- ва Па- ра- ся,
лё -лё
лё- лё


I. Ха- дзі, дзе- вань- ка, сю- ды; я, ма- лой- чык
2. ды той гэ - ту па- ду- шач-ку сва- ю па - да-
3. пу- ха- ва - я па- ду- шач-ка ёй - жа дас- та-
(3 разы)
I. ма- ла- ды,
2. ру- ю.
3. ла- ся.
ой, гэй. Пу- ха- ва- я па- ду-шач- ка



Народная гульня із скокамі. Словы ўзятыя із фальклёрных зборнікаў і апэрэты "У вырай". Мэлёдыя скампанаваная паводля народных звароткаў. Хлапцы й дзяўчаты робяць кола, на сярэдзіну якога выходзіць адзін хлапец і пад сьпеў выбірае сабе з кола дзяўчыну.

Карагод: Падушачка, падушачка
Мая пухавая;
Малодачка, малодачка,
Ой, ды маладая.

Хлапец: У таночку хлапец скача,
Дзеўку красную убачыў.
Хадзі, дзеванька, сюды;
Я, малойчык малды,
Каго люблю, каго люблю,
Тую, тую пацалую
Ды той гэту падушачку
Сваю падарую.
Мяне, моладца, кахала,
Ой, ды папова Парася,
Пухавая падуушачка
Ёй-жа дасталася.

Карагод: Пухавая падушачка
Ёй-жа дасталася.

(Падчас сьпеву апошняе звароткі хлапец скача ізь дзяучынаю, потым пакідае яе на сярэдзіне кола, а сам становіцца у карагод, альбо зусім выходзіць із гульні. Цяпер выбірае сабе хлапца дзяучына, што засталася у сярэдзіне кола
Карагод: (сьпявае) "Падушачка" і.г.д.)

Дзяўчына: Па вуліцы ды дзяўчына йшла,
Краснага малойчыка знайшла.
Малойчыку, малойчыку мой,
Ці ня пойдзеш пагуляць са мной?
Каго люблю, каго люблю.
Таго, таго пацалую,
Таму гэту падушачку
Сваю падарую.
Я любіла, я кахала,
Ой, таго папова Яся,
Пухавая падушачка
Яму дасталася.

Карагод: Пухавая падушачка
Яму дасталася.

(У часе апошняе звароткі дзяучына скача із хлапцом, пакідае яго на сярэдзіне кола, а сама становіцца у карагод альбо выходзіць із гульні. Тады хлапец, што застауся на сярэдзіне кола, выбірае сабе дзяучыну, і гульня з тымі-ж самымі сьпевамі працягваецца далей, паводля жаданьня. У канцы гульні карагод сьпявае сваю пачатную зваротку)

Лянок

Народная жаночая гульня із скокамі. Словы — народныя, мэлёдыя зь ільняных песьняў. Дзяўчаты становяцца ў рад на адлегласьць выцягнутай рукі адна другой. Сьпяваючы, яны робяць адпаведныя тэксту рухі — сеюць, поляць, трэплюць і г.д.. На словах прыпеву "Ты удайся, лянок" усе йдуць на авансцэну, на словах "Пакахай мяне, міленькі" робяць нізкі паклон, а потым, танцуючы, адыходзяць на свае месцы, на сярэдзіне сцэны. Пасьля апошняе звароткі, на жаданьне, могуць быць агульныя скокі з рухамі, падобнымі да працы над ільном.

1. Ды я сеяла, ўжо сеяла лянок,
Я сеяла, прыгаварвала,
Чабаткамі прыкалачывала.

Прыпеў: Ты удайся, удайся, лянок,
Ты удайся, лянок беленькі,
Пакахай мяне міленькі.

2. Ой, палола ўжо, палола я лянок,
Я палола, прыгаварывала,
Чабаткамі прыкалачывала.

Прыпеў:

3. Ды трапала, ўжо трапала я лянок,
Я трапала, прыгаварывала,
Чабаткамі прыкалачывала.

Прыпеў:

4. Ой, і прала я, ўжо прала я лянок,
Ой, я прала, прыгаварывала,
Чабаткамі прыкалачывала.

Прыпеў:

5. Ды і ткала, ўжо ткала я лянок,
Ой, я ткала, прыгаварывала,
Чабаткамі прыкалачывала.

Прыпеў:

6. Ой, я малада сарочку адзела,
Апранала прыгаварывала,
Чабаткамі прыкалачывала.

Прыпеў: Ой, удаўся, удаўся, лянок,
Ой, удаўся лянок беленькі,
Пакахаў мяне міленькі.

Лянок

Allegretto

mf

Ды я се-я- ла, ўжо

се- я- ла ля- нок, я се- я- ла, пры- га- ва- ры- ва-

ла, ча-бат- ка- мі пры-ка- ла- чы-ва- ла. Ты у-

Прыпеў:

дай- ся, у- дай- ся, ля- нок, ты у- дай -ся, ля- нок


poco meno
бе- лень- кі, па- ка- хай, па- ка- хай мя-не,
мі- лень- кі.
f
1.2345.
для канца
St

Хмель


Moderato con moto
mf
Дзеў-кі хме-ля са-дзі-лі,
дзеў-кі хме-ля са-дзі- лі, ды,са-дзіў-шы,га- ва- ры- лі,
ды, са-дзіў-шы,га-ва- ры- лі: -рась- ці, рась- ці, хме- лю,
тон- кі ды вы- со-кі, ка- ра- ніс-ты ды глы- бо- кі,



Народная гульнявая песьня. Можа быць пастаўленая ў трох варыянтах: 1) як гульня з рухамі й гэстамі паміж дзяўчатамі й хмелем, згодна вымогаў тэксту; 2) як карагод і 3) у спалучэньні першага з другім, калі дзея будзе адбывацца ў карагодным коле.

1. Дзеўкі хмеля садзілі, (2 разы)
   Ды, садзіўшы, гаварылі: (2 разы)
   — Расьці, расьці, хмелю. тонкі ды высокі,
   Караністы ды глыбокі. (2 разы)

2. Віўся, віўся тонкі хмелю
   Ды прывіўся да гароды;
   Стаў прасіцца тонкі хмелю:
   — Пусьці мяне начаваці,
   Дзе пакоі новы,
   Пасьцелі пуховы,
   Дзе дзяўчаты маладыя. (2 разы)

3. Дзеўкі хмеля — за ваконца, (2 разы)
   Кінулі хмель на дарогу: (2 разы)
   — Няхай коні топчуць,
   Топчуць капытамі,
   Малойчыкі чабаткамі. (2 разы)

В. скокі

Крыжачок



Мікіта

Allegretto

Хор:

Ой, у на- ша - га Мі- кі- ты

f

рва-на у - ся ў дзір-ках сьві-та. Мі- кі-та, Мі- кі-та,

так і гэ- так Мі-кі- та, Мі-кі- та, Мі- кі- та,



для канца

так і гэ-так Мі-кі-та.

f

f

Танец

Allegro moderato

1.

2.



Апрацоўка беларускіх народных скокаў.

1. Ой, у нашага Мікіты
Рвана уся ў дзірках сьвіта.

Прыпеў: Мікіта, Мікіта,
Так і гэтак Мікіта.

2. На таку індык таптаў,
Сьвіту Мікіту парваў.

Прыпеў:

3. Лапці ў нашага Мікіты
Гала-пяткамі падбіты.

Прыпеў:

4. Дасталась Мікіту жаба —
Пакахала стара баба.

Прыпеў:

5. А Мікіта сьпіну чэшыць,
Мікіціха дзяжу месіць.

Прыпеў:

6. А Мікіта дровы сячэць,
Мікіціха бліны пячэць.

Прыпеў:

Трасуха


Allegro
Хор
ой
Дзьме ду- да ра- го- ча йскрыпка,
f
ой
а жа-лей-ка пла- ча,
ой
лой-дзем мі-ле нь- кі ў та-но- чак-
ой
тра-су- ху за- ска- чам.
ой
Танец



Беларуская народная полька з прыпеўкамі

1. Дзме дуда, рагоча йскрыпка,
А жалейка плача,
Пойдзем, міленькі, *) ў таночак-
Трасуху заскачам.

2. Ой ты, руды. хадзі сюды,
А ты, чорны, стой вунь там,
А я з рудым разьбяруся,
Той чарнявы прыйдзе сам.

3. А ці бачыш, Наталька,
Як там скача Міхалка,
Як праз кола ён нясецца,
Чуб на галаве трасецца.

4. Хадзі, хадзі чарнаброва,
Трасуха - вясёлы скок,
Прышчурыся ды вазьміся
Ты за свой за правы бок.

5. Хоць трасіся, не трасіся,
Бо я знаю, што здасіся,
Паратунку тут няма -
Прыйдзеш да мяне сама.

6. Ой, чок, чок, ты, чабаточак,
Халява дзірава.
За што хлопцы дзеўку любяць?
Каса кучарава.

7. Ой, трасуха, ты, трасуха,
Затрасі-ж ты Пятруся,
Ён да хаты мяне цягне -
Я-ж яго не баюся.

8. Ой. трасуха, трасуха,
Зьела баба гусака,
Дзед-жа - парсючка ды гуску
Ўзяў на перакуску.

*) Альбо: мілая

Шастак

Allegro

Хор *f* Шэсьць дзён ма- ла- ці- ла- шас- так за- ра- бі- ла;

Шэсьць дзён шас- так

са- ма ся- бе дзі- ва- ва- ла, што так ма- ла

ой за- раб- ля- ла.

ой што так

ой ой што так

са- ма ся- бе дзі- ва-ва- ла, што так ма- ла за-раб-ля- ла.

ой ой

Танец

Беларускія народныя скокі з прыпеўкамі. Для выкананьня хорам трэба выбраць звароткі й прытрымлівацца да дадзеных усклікаў, ой, у галасох. Шастак выконваецца ў хуткім тэмпе (аллегро). У вапошняй зваротцы, пасьля апошняга "ой", робіцца паўза (люфт паўза), і апошнія два тахты сьпяваюцца павольна й выразна. Для тэнараў і басаў ужываць наступныя словы:

1. Шэсьць дзен. Шастак. і г.д. 2. Тое самае. 3. Мужык, ляжыць. і г.д. 4. Ляжыць, тужыць і г.д. 5. Яму нагой і г.д. 6. Цераз яму і г.д. 7. Ой, ты, а я і г.д. 8. Мужык, а я і г.д.

1. Шэсьць дзён малаціла —
Шастак зарабіла;
Сама сабе дзівавала, (2 разы)
Што так мала зарабляла.

2. Шэсьць дзён малаціла —
Шастак зарабіла;
А за тога шастака (2 разы)
Я купіла мужыка.

3. Мужык — невялік —
На саломцы ляжыць;
А я Бога прашу, (2 разы)
Каб узяў яго душу.

4. На лаўцы ляжыць,
Ня буду тужыць;
Тады толькі патужу, (2 разы)
Як у труну палажу.

5. Ямку пракапала
Ды ножкі пратаптала,
Націснула каменем, (2 разы)
Сама пайшла хадунем.

6. Цераз яму, яму,
На другога гляну, гляну
І кіўну і маргну (2 разы)
Ды да сябе прытулю.

7. Ой ты, дзедзька мой,
А я бабка твая;
Кармі мяне пірагамі, (2 разы)
Каб я гладкая была.

8. Мужык за сталом,
А я з памялом,
Досыць гарэліцу піці, (2 разы)
Ідзі збожжа малаціці.

Allegro moderato

f Ян- ка ста- іць Ян- ка ста-іць на га- ры,

Ян- ка ста- іць

а я ста- ю Ян- ка- се- е ка- ву- ны,

а я у да- лі- не

Ян- ка се- е

а я жу- ра- ві ны. Жу- ра- ві- ны ня ўзый-шлі,

жу- ра - ві- ны, жу- ра- ві- ны

ка мне хлоп-цы не ха- дзі- лі,

ка- ву-ны па- сох- лі,- ка мне хлоп- цы

1.

rit

каб я-ны па- дох-лі па- дох- лі,

для канца

каб я- ны па-дох-лі.

rit

Беларуская народная полька з прыпеўкамі. *)

1. Янка стаіць на гары,
А я стаю у даліне,
Янка сее кавуны,
А я журавіны.
Журавіны ня ўзыйшлі,
Кавуны пасохлі, —
Ка мне хлопцы не хадзілі,
Каб яны падохлі,
падо-о-о-хлі

Альт: Янка стаіць на гары, а я... у даліне,
Янка сее кавуны... журавіны.
Тэнар: Янка стаіць (2 разы), Янка стаіць...
А я у даліне,
Янка сее... журавіны.
Бас: А я у даліне...
Журавіны.
Альт, Тэнар, Бас: Журавіны... кавуны... пасохлі,
Ка мне хлопцы... каб яны падохлі,
падо-о-ох-лі.

2. Я на рэчцы хустку мыла
Ды на плот павесіла,
Дзесяцёх ўсяго любіла,
Аднаго пацешыла.
Чаго-ж, Янка, ты галосіш,
Я цябе пацешу:
Ды, пашыўшы зрэбну торбу,
На шыю павешу,
паве-э-э-шу.

Альт: Я на рэчцы хустку мыла ды... павесіла,
Дзесяцех ўсяго любіла... ды пацешыла.
Тэнар: Я на рэчцы (2 разы) хустку мыла...
Ды павесіла...
Я любіла... ды пацешыла.
Бас: Ды павесіла...
Ды пацешыла.
Альт, Тэнар, Бас: Чаго-ж, Янка... я цябе пацешу:
Ды, пашыўшы... на шыю павешу,
паве-э-э-шу.

3. Сьвеціць ярка ў небе зорка.
Дзе-ж падзеўся мой Міколка?
Цераз поле грэбелька —
Дзе падзеўся Хведарка?
Паміж лесу прыгорак — —
Дзе дзяваўся Рыгарок?
Адцураліся, ня йдуць — —
Мусіць, мяне забудуць,
забу-у-у-дуць.

Альт: Сьвеціць ярка ў небе зорка.
Дзе-жа... мой Міколка?
Цераз поле грэбелька —
Дзе-жа... Хведарка?
Тэнар: Сьвеціць ярка (2 разы) у небе зорка.
Дзе-жа... мой Міколка?
Цераз поле... Дзе-жа... Хведарка?
Бас: Дзе-жа... мой Міколка?
Дзе-жа... Хведарка?
Альт, Тэнар, Бас: Паміж лесу... дзе дзяваўся
Рыгарок?
Адцуралісь... мусіць, мяне забудуць,
забу-у-у-удуць.

*) Паводля традыцыі выкананьня, Полька-Янка пачынаецца даволі мерна й паступова набірае тэмпу. У тых месцах, дзе сьпяваюцца словы "падо-о-охлі", "паве-э-эшу" й "забу-удуць", вымагаюцца павольнасьць і падкрэсьленасьць. А пошняя зваротка (паўтор першае) сьпяваецца з магчымай хуткасьцю (прэсто), а пасьля словаў "ка мне хлопцы не хадзілі" йдзе канцоўка, паказаная ў нотах крыжыкам.

Лявоніха

Allegro moderato

f ой, ой, Ой, Ля-во-ні- ху Ля- вон па-лю- біў, ча- ра - віч-кі

ён Ля- во- ні- се ку- піў. Ля-во-ні-ха ду- ша лас- ка- ва- я -

ча- ра- віч -ка - мі па -ляс - кі ва - ла.

Poco più

тр

А ка-лі-ж я у ма -туль-

p ой, ой, ой

кі бы- ла, я, як ві-шань- ка ў са-доч -ку ць ві-ла, цьві-ла, цьві-ла

ой ой у са- доч- ой,

ды паць-ві- ты ва -ла, ой гу- лі -ва - ла.

ой, ой, з ма-лай-ца- мі ды па- гу- лі- ва- ла.

ой ой

ой, ой, ой, ой, што но- вы- я

А дзе ты- я ка-ва-лёч- кі жы- вуць,

та- па - роч- кі ку- юць? ой, ой, ой, ой, ой, ой,

ку-юць, ку- юць ды пад-ва - ры-ва- юць,

Allegro vivo

ой, зма- ні- ва-юць. Ой, Ля-во-ні- ху Ля-вон

на-шых дзе-вак ды пад- ма- ні- ва-юць.

па- лю-біў, ча-ра-віч-кі ён Ля-во-ні-се ку-піў. Ля-во-ні-ха

ду-ша лас-ка-ва- я ча-ра-віч-ка- мі па- ляс-

кі-ва- ла. Ой, Ля-во-ні- ха Ля-во-ні- ха ма-я,

meno

ff

Allegro vivo

ой чорт, а ня я

ня-хай ця- бе лю- біць чорт,

Танец



Беларускія народныя скокі з прыпеўкамі. *)

1. Ой, Лявоніху Лявон палюбіў,
Чаравічкі ён Лявонісе купіў.
Лявоніха — душа ласкавая —
Чаравічкамі палясківала.

2. Ой, Лявоніха ня жонка была —
Нямытую мне кашулю дала,
Нямытую, некачаную,
У суседа пазычаную.

3. А калі-ж я у матулькі жыла,
Я, як вішанька у садочку, цьвіла,
Цьвіла, цьвіла ды й пацьвітывала,
З малайцамі ды й пагулівала.

4. Ой, згубіла мяне мамачка мая,
Што за цябе мяне замуж аддала.
Ой, чаму-ж цябе Пярун не забіў,
Як ты мяне маладзеньку любіў?

5. Дасталась я злому духу-мужыку:
Ссушыў мяне ён, як ліпачку ў духу.
А некаму наказаць, наказаць,
Злога духа прывязаць, прывязаць.

6. А я татку накажу, накажу,
Злога духа прывяжу, прывяжу:
— Не хадзі ты, баламуты, у наш двор,
Не насі-жа ты худобы у наш дом.

7. Наехала повен двор татароў
Ды забралі майго мужа у палон.
Ды ня шкода, што яго увязьлі,
Толькі шкода, што ня моцна зьвязалі.

8. Ён, паганец, уцячэць, уцячэць,
Мне галоўку натаўчэць, натаўчэць.
Трэба будзе уцякаць, уцякаць,
Зь вераб'ямі пад страхою начаваць.

9. А дзе тыя кавалёчкі жывуць,
Што новыя тапарочкі куюць?
Куюць, куюць ды падварываюць,
Нашых дзевак ды падманіваюць.

10. Ой, каб цябе ды Пярун той забіў,
Як я цябе, маладзеньку, любіў.
Ой, Лявоніха, Лявоніха мая,
Няхай цябе любіць чорт, а ня я.

*) У харавым варыянце словы магчыма пераставіць па-жаданьню, дзеля пашырэньня, музычныя звароткі паўтарыць, ці наадварот скараціць. Акампанімэнтам для хору можа служыць як сама харавая партытура, гэтак і танец. Хор пачынаецца ня вельмі хутка, але канец, са слоў "Ой, Лявоніху" выконваецца ў хуткім тэмпе (аллегро-віво), пасьля слова "мая" робіцца вытрыманая паўза і далей ідзе павольна з гучнаю фэрматаю на слове "чорт". Апошнія словы "а не я" вымаўляюцца вельмі хутка.

Мяцеліца

Allegro con fuoco

1) Гэй, мя-це лі-ца, гэй гэй

Прыпеў:

Го-ца-ца, го-ца-ца, го-ца-ца, ой, ку-ры ць ве-і ць мя-це- лі- ца

2) Я мі-ло-га ды да сэр-ца пры-ту-лю, па-ца-лун-ка-мі да пя-на на-па-ю.

Ой, мя-це-лі-ца па ву-лі-цы мя-це, мо ка мне май-го мі-ло-га прымяце.

ой ой, ой, Прыпеў:

3)

ой, ой,

Ой, ку- рыць, ве- іць мя-це- лі- ца. Дзе мой мі-лень-
Хоць-жа на два- ры мя-це- лі- ца, ды ха- хол я-

кі па- дзе- нец- ца?
го бя- ле - ец- ца.

Прыпеў:

4) Як па ву- лач-ках я-

Го- ца- ца, го- ца- ца,

Прыпеў:

на мя- це, за мя- це- лі- цай зі- ма і- дзе.

го-ца- ца, ой,ку-рыць,ве- іць мя-це лі- ца. гэй

гэй гэй,

мя- це- лі- ца, гэй.

ff

Танец

для канца

Беларускія народныя скокі з прыпеўкамі.

1. Ой, мяцеліца па вуліцы мяце,
Мо' ка мне майго мілога прымяце.
Я мілога ды да сэрца прытулю,
Пацалункамі да п'яна напаю.

Прыпеў: Гоцаца, гоцаца, гоцаца,
Ой, курыць, веіць мяцеліца.

2. Ой, курыць, веіць мяцеліца.
Дзе мой міленькі падзенецца?
Хоць-жа на двары мяцеліца,
Ды хахол яго бялеецца.

Прыпеў:

3. Бадай таго каваля, каваля
Мяцеліца замяла, замяла,
Як ён мяне, маладу, маладу,
Ды змарозіў на ляду, на ляду.

Прыпеў:

4. Ой, мяцеліца, мяцеліца,
Ды чаму стары ня жэніцца?
А як яму ажаніціся:
Усе будуць тут дзівіціся.

Прыпеў:

5. Ой, курыць, веіць мяцеліца,
Можа стары і ажэніцца.
"Ды яшчэ-жа я зусім ня стар,
Яшчэ вус мой і сівы ня стаў".

Прыпеў:

6. Ой, мяцеліца, мяцеліца,
Чаму-ж дзеванькі ня целяцца?
А вось як-жа ім цяліціся,
Няма хлопцаў, каб жаніціся.

Прыпеў:

7. Закурылася мяцеліца,
Можа стары і ажэніцца,
А што каму, што каму да таго,
Можа я і пакахаю яго.

Прыпеў:

8. А па вуліцы мяцеліца мяце,
Мой міленькі бочку мёду мне нясе.
Ой, ня рада я так мёду таму,
Толькі рада я мілому свайму.

Прыпеў:

9. Ой, курыць, веіць мяцеліца,
Нікуды дзеўка ня дзенецца.
Ой, па вуліцы мароз ідзе,
А дзе-ж дзеўка начаваць будзе?

Прыпеў:

Юрачка

Allegro

f Ах, ты Ю- рач-ка, што ня- жэ- ніш- ся, прый-дзе зі-

мач- ка, дзе ты дзе- неш- ся? Тра-та- та-та та-та,

тра- та

тра- та- та- та -та- та, тра- та- та- та- та- та,

тра- та тра- та


1.2.3.4.
для канца
тра- та- та-та-та- та.
ля
ля- ля-
ля
тра- та
ff


Танец
для канца

Беларускія народныя скокі з прыпеўкамі.

1. Ах ты, Юрачка, што ня жэнішся,
Прыйдзе зімачка, дзе ты дзенешся?

Прыпеў: Тра-та, та-та-та-та. (4 разы)

2. Ой, каровонька ды ня целіцца,
А наш Юрачка ўсё ня жэніцца.

Прыпеў:

3. Як яму, блазну, ды жаніціся,
Цэлы сьвет будзе ды дзівіціся.

Прыпеў:

4. Ой, дуб на гары, дубовая лазьня,
Ня дай, татачка, за такога блазна.

Прыпеў:

5. Мы-б цябе, Юрачка, ды пацешылі,
На асіначцы ды й-б павесілі.

Прыпеў:

6. Мы-б табе, Юрачка, шчэ й дагадзілі,
Дротам моцненька ды прывязалі.

Прыпеў:

7. Ой-жа, Юрачка, ты вісі, вісі,
Пакуль ўсё лісьце з дрэва не зьясі.

Прыпеў:

Бульба

Апрацоўка беларускіх народных скокаў.

1. Гарні, гарні бульбу зь печы
У торбачку ды на плечы.
Бульбу пякуць, бульбу вараць,
Бульбу ядуць, бульбу хваляць.

Прыпеў: Трам-там-там, тара-ра-ра-ра-ра-рам
Бульбу пякуць, бульбу вараць,
Трам-там-там, тара-ра-ра-ра-ра-рам
Трам-там пірам, тара-ра-рам.

2. З бульбы мука, з бульбы каша,
Прападзі ты, доля наша.
Адзін лапаць, другі бот,
А я шляхціч, далі Бог.

Прыпеў:

3. Ай, ды туры, растатуры,
Я шляхоцкае натуры,
Што сыботы ем бліны,
А ў нядзелю — кавуны.

Прыпеў:

Бульба

Allegro moderato

f Гар-ні гар-ні буль-бу зь пе-чы

у тор-бач-ку ды на пле-чы. Буль-бу пя-куць, буль-бу ва-раць

Прыпеў:

Трам-там-там-та-ра- ра-ра-ра-ра-рам,

буль-бу я-ду-ць бу-льбу х ва-ляць трам- там та- ра ра-рам

Трам-там- та- ра- рам

трам

буль-бу пя- куць бульбу ва- рацъ, трам- там- там- та- ра.

пам па... пам пам

трам, трам трам- там-трам- там,

та-ра- ра- ра- рам,

1.2.

трам -там пі- рам, пі- ра -рам.

трам- там, трам-там

3.

пі- ра- рам.

8

Таўкачыкі


Allegretto
1
Хор:
f Гэй, гэй, таў-ка-чы-кі, гэй, гэй, ду-бо-вы-я.
f
гэй
гэй
Прыпеў:
f Гэй, гэй, таў-ка-чы-кі, гэй, гэй, ду-бо-вы-я.
2 3
Солё:
Прыпеў:
f Таў-ка-чы-кі ду-бо-вы-я ды да пра-цы га-то-вы-я.
Хор: гэй

Хор:

f Х сем год ва-л я-лі- ся, па-куль па-ну па- па- лі- ся. Прып.

Танец *Allegro moderato*

для канца

Хор Прыпеў: гэй, гэй, таў-ка-чы-кі, гэй, гэй, ду-бо-вы-я. гэй

Беларускія народныя скокі з прыпеўкамі. *)

1. Гэй, гэй, таўкачыкі,
Гэй, гэй дубовые.
Прыпеў: Гэй, гэй, таўкачыкі,
Гэй, гэй дубовые.

2. Таўкачыкі дубовыя
Ды да працы гатовыя.
Прыпеў:

3. Трэба пана паслухаці,
Таўкаачамі пастукаці.
Прыпеў:

4. Сем год валяліся,
Пакуль пану папаліся.
Прыпеў

5. Таўкачу, таўкачу,
Я да Зосячцы хачу.
Прыпеў:

6. Ой, чок, чабаток,
Хадзем, міленькі, на ток.
Прыпеў:

7. Гэй, іграйце, музыкі,
Мае лапці вялікі.
Прыпеў:

8. Гэй, гэй, таўкачыкі,
Гэй, гэй, дубовыя,
Гэй, гэй, дубовыя
Ды на працу гатовыя.

*)Пры харавым выкананьні робіцца так: 1-ая зваротка сьпяваецца, як і прыпў, усім хорам; 2-ую зваротку сьпявае солёва адзін з хлапцоў пад суправаджэньне хору, прыпеў - цэлы хор; 3-юю зваротку сьпявае солёва жаночы голас пад суправаджэньне хору, а прыпеў - зноў цэлы хор; 4-ая зваротка й прыпеў сьпяваюьцца цэлым хорам, а далей ізноў у тым-жа парадку і, урэшце, бярэцца апошні варыянт прыпеву.

ЗЬМЕСТ

Ад аўтара 3
Заўвагі да карыстаньня 4

ЗЬ ГІСТАРЫЧНАГА МІНУЛАГА

1. Песьня аб долі 5
2. Аб галубінай кнізе 12
3. Песьня дружыны Ўсяслава 14
4. Абарона Крычава 17
5. Бітва пад Воршай 19
6. Ой, арол, ты арол 21
7. Песьня Каліноўцау 23
8. Паўстань, народ 26
9. Сакавік 29
10. У бой за Случчыну 35
11. Роднае слова 38
12. Марш Беларускае моладзі 40

РАМАНСЫ Й ПЕСЬНІ НА СЛОВЫ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТАЎ

13. О, Беларусь, мая шыпшына 43
14. А вясна ідзе на Беларусі 45
15. Мова родная 48
16. Не забуду я 50
17. Дзяўчаты-дзяўчыначкі 53
18. Дарогай 56
19. Ты прыйдзі 58
20. Каб была я перапелкай 60
21. Васілёчкі 62
22. Ня першы раз 64
23. Песьня мая, песьня 66
24. Месячыку-месяц 68
25. Вясьнянка 70
26. Песьняй толькі 74
27. Я ад вас далёка 75
28. Па дзяўчыне любай 79
29. У зялёным садочку 81
30. Поле, ты поле 84

ЛІРЫЧНЫЯ НАРОДНЫЯ ПЕСЬНІ

31. Ігруша 86
32. Я табун сьцерагу 87
33. Ой ты, саду 90
34. Ды я жала да вечара 91
35. Як у нас улетку 92
36. Хадзіў, пахадзў Ясь па полю 95
37. Ой, ляцелі гусі 96
38. Пахадзілі мае ножкі 98
39. Ці я ў цябе мой ты татухна 99
40. Баліць мая галованька 101
41. Туман 102
42. Палыночак 104
43. Дубравачка 106
44. А ў нашага пана 107
45. Ах ты, дуб'е 109
46. Ой, пры Дунаі 110
47. Ой, борам, борам 113
48. Позна сонца 116
49. Касецкая 117
50. Ой, бору мой 118

51. Бярозанька 119
52. Ой-жа ты, сонца 120

ПЕСЬНІ ЛЁГКАГА ЖАНРУ

53. Рыцар казкі 121
54. Ціхі летні вечар 123
55. Гітара 125
56. Незнаёмка 129
57. Пакахай 131
58. Сумная згадка 136
59. Туга 137
60. Да цябе, дарагая 141
61. Васількі 143

ЖАРТЫ, ГУЛЬНІ Й СКОКІ

А. ЖАРТОЎНЫЯ ПЕСЬНІ

62. Ой, ня хочацца мяне, моладзі 146
63. А ў бары сасна 148
64. Прамова свата 150
65. Ой з-пад лесу 154
66. Ой, у лесе, пры гушчары 156
67. Цераз сад-вінаград 160
68. Усё, як трэба 163
69. Я у бацкі йшчэ была 166
70. А дзе я радзілася—ня была 168
71. А я з хлопцам стаяла 169
72. Камічны дуэт 171
73. Народныя прыпеўкі: а. варыянт першы 175
б. варыянт другі 177
в. варыянт трэці 179

Б. ГУЛЬНІ

74. Мост 180
75. Кума-ж мая, кумачка 182
76. Ах, Сею-ж мой, Вею 187
77. Дзед і баба 188
78. Канапелькі 190
79. Ах вы, кумачкі мае 191
80. Падушачка 193
81. Лянок 198
82. Хмель 200

В. СКОКІ

83. Крыжачок 202
84. Мікіта 203
85. Трасуха 205
86. Шастак 207
87. Янка 209
88. Лявоніха 212
89. Мяцеліца 215
90. Юрачка 219
91. Бульба 222
92. Таўкачыкі 224